

ЦІ ШКОДНЫ «ВОДАР» СЦЁКАЎ? 4

ГЛІНЯНАЯ ЦАЦКА — ПРАФЕСІЯ І ХОБІ 9



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

2 КАСТРЫЧНІКА 2019 г. СЕРАДА № 187 (29054)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксандр СКУРАТАЎ, дырэктар Беларускага дзяржаўнага інстытута стандартызацыі і сертыфікацыі:**

*«Дзяржаўная праграма развіцця электратранспарту ў Беларусі прайшла адпаведную навукова-тэхнічную экспертызу, узгадненне з зацікаўленымі органамі дзяржкіравання. Мы чакаем яе зацвярджэння ў найбліжэйшы час. Дзяржпраграма прадугледжвае распрацоўку прыблізна 50 стандартаў у сферы электратранспарту. Гэта стандарты не толькі на бяспеку электратранспарту, але і на элементы інфраструктуры, зарадныя станцыі, метады выпрабавання электрычнага абсталявання. З улікам планаў краіны па развіцці электратранспарту вывучаецца міжнародны, у тым ліку і кітайскі вопыт у гэтай сферы. У кітайскіх калег ёсць напрацоўкі, цікавыя беларускаму боку».*



Фота БелТА.

# ЯК ЗНАЙСЦІ ШЧАСЦЕ ЎНУТРЫ САЮЗА?

### Беларусь прапаноўвае ЕАЭС супрацоўнічаць з краінамі далёкай дугі, але пры гэтым атрымліваць большую выгаду ад гандлю паміж сабой

**Сваё бачанне далейшага развіцця саюза на пасяджэнні Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета ў Ерэване прадставіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. Асаблівую ўвагу, на яго думку, у міжнародным парадку дня неабходна ўдзяліць краінам далёкай дугі, дзе тавары і паслугі ЕАЭС пакуль яшчэ мала вядомыя. Падключыцца да гэтай работы лідар Беларусі прапанаваў Еўразійскаму банку, нацыянальным банкам і іншым фінансавым структурам саюза.**

СТАР. 2

# ЖУРАВІНАВЫ СЕЗОН



Журавінавы сезон у разгары. Жыхарка вёскі Язна Мёрскага раёна Валянціна КОЗЫРАВА *(на фота)* не ўпускае ніводнага дзянёчка, каб не пабыць на бліжэйшым балотным масіве Жады і не набраць журавін. Работа па збіранні ягад нялёгкая, дарога доўгая і небяспечная, але жанчына любіць і гэтую работу, і само балота.

— Шаснаццаць гадоў хаджу на Жады, для гэтага бяру адпачынак. Журавіны даюць мне дадатковы заробак, — кажа Валянціна напрыканцы свайго чарговага рабочага дня на балоце.

Такіх працавітых і руплівых, як Валянціна Козырава, на Жадах цяпер шмат. Як бы яно ні было, усе радуюцца багатаму ягаднаму ўраджаю і за лічаныя гадзіны запаўняюць свае заплечнікі і мяшкі пад самую завязку, быццам сапраўдныя прафесіяналы. І яшчэ дзякуюць. Вось і Валянціна, выходзячы з балота з цяжкай ношай, не забывае паўтараць: «Дзякуй Богу! Дзякуй надвор'ю!» Дзякуй балоту!»

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

*(Працяг фотарэпартажу пра журавінавае балота Жады глядзіце на 13-й старонцы).*

## КОРАТКА

- **Беларусь возьме ўдзел у глабальным саміце ЮНІСЕФ для мэраў гарадоў, дружалюбных дзецям.**
- Кантактная група па Украіне пачала пасяджэнне ў Мінску.
- **У Беларусі стартуе рэпетыцыйнае тэсціраванне.**
- Натарыусы Віцебскай вобласці 7—14 кастрычніка бясплатна пракансультуюць шматдзетных маці.
- **У Беларусі пачаў работу адзіны аператар нафтаправода «Дружба».**
- Жыхар Брэста вырошчваў каноплі ў арандаваным гаражы.

На сваім месцы

# Сто гадоў на дваіх

### У аграгарадку Антопаль паўвека працуе сямейная пара дактароў

**Маладыя і прыгожыя, з дыпломамі Мінскага медыцынскага інстытута, яны прыехалі ў Антопаль па размеркаванні ў 1969 годзе. У рабоце, у сямейных клопатах праляцелі 70-я, потым адносна спакойныя 80-я, за імі пераменлівыя 90-я, і вось ужо амаль 20 гадоў новага стагоддзя. А Вера Міхайлаўна і Віктар Уладзіміравіч ЕНІЧЫ працуюць на тым жа месцы, і маюць па адным запісе ў працоўнай кніжцы. Ён — стаматолаг-артапед, яна — акушэр-гінеколаг. Нядаўна іх урачыста ўшанавалі на раённым мерапрыемстве. Старшыня Драгічынскага райсавета дэпутатаў Святлана БАРТАШ уручыла ганаровыя граматы, былі кветкі і добрыя словы, віншаванні калег з юбілеем працоўнай дзейнасці.**

СТАР. 5



Фота Івана ЛЯВОНЧЫКА.

Падчас уручэння ўзнагарод.

ISSN 1990 - 763X

19187>

# ЯК ЗНАЙСЦІ ШЧАСЦЕ ЎНУТРЫ САЮЗА?

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

Пазітыўным чынам развіваецца супрацоўніцтва ЕАЭС з трэцімі краінамі. З Іранам саюз працуе над стварэннем зоны свабоднага гандлю. Акурат падчас саміту было падпісана Пагадненне аб зоне свабоднага гандлю з Сінгапурам.

«Вашы краіны для нас з'яўляюцца вельмі значнымі партнёрамі, а патэнцыял для нарошчвання эканамічных сувязяў велізарны. Замацаваўшы рэжым прэферэнцый, важна падштурхнуць бізнес і ўрады да больш планамернага ўзаемадзеяння», — звярнуўся Аляксандр Лукашэнка да Прэзідэнта Ірана Хасана Роўхані і прэм'ер-міністра Сінгапура Лі Сянь Луна, якія прысутнічалі на пасяджэнні.

Кіраўнік Беларусі адзначыў гатоўнасць да заключэння дагавора аб свабодным гандлі з Сербіяй і нагадаў, што ў кастрычніку ўступае ў сілу Пагадненне аб гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве з Кітаем.

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, на ўчарашняй сустрэчы кіраўнікі краін саюза зацвердзілі Канцэпцыю фарміравання агульнага фінансавага рынку ЕАЭС, заклаўшы аснову для забеспячэння свабоднага руху капіталу і паслуг. Такі рынак павінен быць звязаны з лічбавізацыяй, што дазволіць развіваць перадавыя фінансавыя тэхналогіі. На думку Прэзідэнта Беларусі, у ЕАЭС ужо нямала зроблена для лічбавай трансфармацыі эканомікі: «Гэты кірунак набірае абароты, і час яго ўпарадкаваць, дапоўніць адпаведнымі нормамі Дагавор аб саюзе. Адначасова трэба звярнуць увагу на пытанні інфармацыйнай бяспекі, выпрацаваць адзіныя стандарты і фарматы ўзаемадзеяння».

Адказваючы на пытанне карэспандэнта расійскага тэлебачання, Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што ўнутраны гандаль у саюзе скараціўся і такая ж тэндэнцыя ў знешнім гандлі з іншымі краінамі: «Я думаю, перш чым казаць пра гандаль, дапусцім, ЕАЭС у цэлым, трэба падумаць пра тое, як знайсці шчасце ўнутры нашага саюза, як зрабіць так, каб найбольшую выгаду атрымалі ад гандлю ўнутры. А для гэтага трэба здымаць бар'еры, трэба быць абавязковымі».

Падчас сустрэчы ў пашыраным фармаце Аляксандр Лукашэнка заклікаў сваіх калег прыняць палітычнае рашэнне для ліквідацыі бар'ераў на прасторы Еўразійскага эканамічнага саюза.

«Сёння мы надзялілі камісію паўнамоцтвамі ў пытаннях маркіроўкі тавараў і нагляду за іх рухам. ЕЭК павінна гарантаваць, што гэтыя пратэкцыйныя прапановы не абернуцца новымі перашкодамі ў гандлі. Бар'ераў у саюзе і так дастаткова, — сказаў Прэзідэнт Беларусі. — Асабліва насцярожвае, калі яны ўводзяцца ў такіх адчувальных сферах, як, напрыклад, дзяржзакупкі. Прыйшоў час кіраўнікам дзяржаў разгледзець набалелую тэму і прыняць палітычнае рашэнне».

Налета да Беларусі пяройдзе старшынства ў Еўразійскім эканамічным саюзе, і краіна сур'ёзна рыхтуецца да гэтага. Паводле слоў Прэзідэнта Беларусі, у развіццё ЕАЭС трэба ўкласці яшчэ шмат сіл і сродкаў, каб не пазней за 2025 год або нават раней стварыць усёабдымны і эфектыўны эканамічны саюз, пабудаваць адзіныя рынкі, сфарміраваць адзіныя галіновыя палітыкі і рэалізаваць палажэнні Дагавора аб ЕАЭС.

У размове з журналістамі намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Ігар Петрышэнка паведаміў, што кіраўнікі дзяржаў дамовіліся па традыцыі ў снежні сабрацца ў Санкт-Пецярбургу на пасяджэнне Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета. Там, магчыма, будзе прынята канчатковае рашэнне па старшыні Калегіі Еўразійскай эканамічнай камісіі і, адпаведна, па размеркаванні «партфеляў» паміж краінамі.

**Паводле БелТА.**

# МАГЧЫМАСЦЬ ПАЧУЦЬ АДНО АДНАГО

**7 кастрычніка ў сталіцы Беларусі стартуе «Мінскі дыялог», яго тэма: «Еўрапейская бяспека: адысці ад краю бездані». Ён будзе доўжыцца два дні.**

Першы форум «Мінскага дыялогу» адбыўся ў маі 2018 года. Ён сабраў больш за 500 удзельнікаў з 59 краін, на ім выступілі кіраўнік беларускай дзяржавы, Генеральны сакратар АБСЕ, высокапастаўленыя прадстаўнікі НАТА, АДКБ, Савета Еўропы і Савета дзяржаў Балтыйскага мора.

Да ўдзелу ў сёлетнім форуме запрошаны ўсе вышэйшыя асобы Беларусі, у прэзідэнцкай сесіі возьмуць удзел таксама экс-прэзідэнт Грузіі Георгій Маргвелашвілі і экс-прэзідэнт Харвацкай Рэспублікі Сцяпан Месіч.

Зрэшты, **заснавальнік і дырэктар Савета па міжнародных адносінах «Мінскага дыялогу» Яўген ПРЭЙГЕРМАН** падкрэслівае, што гэта — ні ў якім разе не чарговы форум, хоць тэме рэгіянальнай бяспекі прысвечаныя многія мерапрыемствы як у свеце, так і ў Еўропе. Але толькі тут, на пляцоўцы «Мінскага дыялогу» сустракаюцца тыя, каму дзеля бяспекі сустрэцца вельмі важна, але яны больш ні на адной пляцоўцы з розных прычын не сустракаюцца. У гэтым унікальнасць як «Мінскага дыялогу», так і Беларусі ў нашы дні.

Пашыраецца і колькасць партнёраў «Мінскага дыялогу», сёлета іх 28. Яны прадстаўляюць Германію, Вялікабрытанію, Швейцарыю, ЗША, Расію, Аўстрыю, Францыю і Турцыю.

«Ні ў адной іншай краіне, ні на адной іншай пляцоўцы сёння няма такога, каб Фонд Гарчакова (Фонд падтрымкі публічнай дыпламатыі імя А. М. Гарчакова створаны распараджэннем Прэзідэнта Расіі ў 2010 годзе. — **«Зв.»**) суседнічаў у якасці партнёра па мерапрыемстве з Еўрапейскім фондам у падтрымку дэмакратыі», — упэўнены заснавальнік «Мінскага дыялогу».

Інавацыйнай асаблівасцю сёлетняй сустрэчы арганізатары называюць дыскусію, прысвечаную інфармацыйнай бяспецы. «Мы будзем казаць пра нейкі кодэкс журналіста ва ўмовах інфармацыйнага супрацьстаяння», — растлумачыў Яўген Прэйгерман.

Размова пойдзе таксама пра будучыя праекты ўладкавання бяспекі ў рэгіёне. «Асноўная праблема бяспекі ў тым, што мы пераесталі размаўляць, — лічаць арганізатары «Мінскага дыялогу». — Сёння першачарговая задача сабраць на дыскусійнай пляцоўцы ўсіх тых, хто перастаў паміж сабой размаўляць».

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

Выбары-2019

# Актывісты, партыйныя і замежныя госці

## Цэнтрвыбаркам акрэдытаваў ужо 103 міжнародных назіральнікаў

**За выбарамі дэпутатаў у Палату прадстаўнікоў будуць сачыць 103 міжнародныя назіральнікі — 99 ад Садружнасці Незалежных Дзяржаў (у тым ліку 25 прадстаўнікоў Міжпарламенцкай асамблеі дзяржаў — удзельніц СНД) і чатыры ад Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека АБСЕ. Такія звесткі Цэнтральная камісія Беларусі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў прадставіла па стане на 30 верасня.**

Назіральнікамі, акрэдытаванымі пры Цэнтральнай камісіі, сталі восем чалавек ад палітычных партый (ЛДП, БНФ, «Справедливый мир», Камуністычная партыя Беларусі) і грамадскіх аб'яднанняў («Беларускі Хельсінкскі Камітэт», «Белая Русь», БРСМ, «Беларускі саюз жанчын»).

Усяго права быць назіральнікамі ад выбарчых камісій (на апошні дзень верасня) атрымалі 654 чалавекі. З іх 56 грамадзян вылучыліся шляхам падачы заяў, трое прадстаўляюць працоўныя калектывы, 47 — палітычныя партыі, 548 — грамадскія аб'яднанні. З палітычных партый найбольш актыўна (35 членаў) прадстаўлена Камуністычная партыя Беларусі. З шэрагу грамадскіх аб'яднанняў па колькасці назіральнікаў лідыруюць «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі» (116 чалавек), «Белая Русь» (111 чалавек) і прафесійныя саюзы (92 чалавекі).

Па звестках ЦВК, на 27 верасня паступіла 197 зваротаў ад грамадзян. Яны датычацца тлумачэнняў выбарчага заканадаўства, дзейнасці выбарчых камісій, ініцыятыўных груп, вылучэння кандыдатаў і іншага.

**Марыя ДАДАЛКА.**

# БЕЛАРУСЬ ПОМНІЦЬ

**Мітынг-рэквіем адбыўся ў вёсцы Брусы Мядзельскага раёна каля помніка ахвярам фашызму.**

Трагедыя разыгралася 27 верасня 1943 года. Карнікі раніцай акружылі вёску. Жыхароў выгналі на вуліцу і сабралі ў адным месцы. Затым адабралі 46 працаздольных чалавек ад 20 да 50 гадоў і павялі пад канвоем у вёску Лынтупы для адпраўкі ў Германію. У Брусы карнікі прыгналі таксама жыхароў вёскі Лужы, хутара Гаць, што не паспелі ўцячы ў лес. Людзей сагналі ў хлеў і падпалілі, па тых, хто спрабаваў бегчы, стралялі і зноў кідалі ў агонь. Усяго згарэў 41 чалавек.

Помнік у памяць загінулых устаноўлены ў 1981 годзе і ўяўляе сабой скульптуру жанчыны на прадаўгаватым пастаменце, куды ўрэзаны блок з імёнамі ахвяр фашызму. Жанчына-маці ў абгарэлым адзенні нібыта выступае з полымя і абхапіўшы галаву рукамі, шле пракляцці нелюдзям.

На Мядзельшчыне ў гады Вялікай Айчыннай вайны было спалена 68 вёсак, 63 з іх знішчаны цалкам, ахвярамі карнікаў сталі 183 жыхары.

Удзельнікі мерапрыемства ўсклалі кветкі да помніка і ўшанавалі памяць землякоў хвілінай маўчання. Яны таксама заклалі ў капсулу зямлю з воінскіх пахаванняў, якую перадалі ў Мядзельскі музей народнай славы для часовага захавання.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Кітай упершыню прадэманстраваў шэраг найноўшых узбраенняў на ваенным парадзе



Народна-вызваленчая армія Кітая ўпершыню прадэманстравала ў аўторак шэраг найноўшых узбраенняў на парадзе ў гонар 70-годдзя ўтварэння КНР.

Адной з самых чаканых прэм'ер стала міжкантынентальная балістычная ракета DF-41 («Дунфэн-41»). Раней яна ніколі публічна не дэманстравалася. МБР мае галаўную частку, якая раздзяляецца, і ўключае ад 10 да 12 ядзерных блокаў індывідуальнага навядзення. Па розных ацэнках, максімальная далёкасць палёту DF-41 складае каля 14 тыс. км, што робіць яе адной з найбольш дальнабойных балістычных ракет у свеце.

Яшчэ адным яркім момантам наземнай часткі парада стала дэманстрацыя найноўшага ўдарнага беспілотнага лятальнага апарата GJ-11 («Гунцзы-11»). Ён выкананы з выкарыстаннем тэхналогіі радыёлакацыйнай малапрыкметнасці («стэлс») і, акрамя непасрэднага знішчэння цэляў, можа прымяняцца для выканання далёкай разведкі і перахопу.

Вядома, што беспілотнік распрацоўваўся з 2009 года, а першы палёт здзейсніў у 2013 годзе, аднак большасць яго тактыка-тэхнічных характарыстык застаюцца невядомыя.

Назіральнікі адзначылі з'яўленне ў паветранай частцы парада новай мадыфікацыі стратэгічнага бамбардзіроўшчыка H-6N (апошняя мадыфікацыя на аснове савецкага Ту-16). Адной з адметных асаблівасцяў баявой машыны з'яўляецца наяўнасць у яе штангі для дазапраўкі ў паветры, што дасць магчымасць значна павялічыць радыус дзеяння самалёта.

Ва ўчарашнім аглядзе прынялі ўдзел 15 тысяч ваеннаслужачых, а таксама 160 баявых самалётаў і 580 адзінак наземнай баявой тэхнікі. Гэты парад стаў найбуйнейшым у гісторыі Кітая.

## Парашэнка не прыйшоў на правядзенне допыту з выкарыстаннем паліграфа

Былы прэзідэнт Украіны Пётр Парашэнка ў аўторак не з'явіўся на допыт з выкарыстаннем дэтэктара хлусні. Пра гэта паведаміў загадчык аддзялення псіхалагічных даследаванняў Кіеўскага навукова-даследчага інстытута судовых экспертыз Юрый Ірхін.

«Ад Пятра Аляксеевіча не было ніякіх заяў, ён не з'явіўся», — сказаў Ірхін журналістам у эфіры NewsOne. Ён заявіў, што інстытут гатовы правесці допыт, калі Парашэнка ўсё ж такі прыедзе. Разам з тым загадчык аддзялення выключыў магчымасць правядзення экспертызы ў прамым эфіры, на чым раней настойваў Парашэнка. «Судова-псіхалагічная экспертыза не прадугледжвае правядзенне даследавання ў прамым эфіры. Гэта экспертыза, а прамы эфір — гэта шоу», — сказаў ён.

У жніўні Дзяржаўнае бюро расследаванняў Украіны паведаміла, што Пячэрскі раённы суд Кіева даў дазвол на допыт экс-прэзідэнта з прымяненнем дэтэктара хлусні. Рашэнне было выдадзена ў рамках расследавання справы аб верагодным ухіленні Парашэнкі ад выплаты падаткаў пры куплі-продажы тэлеканала «Прамы».

Пасля паражэння Пятра Парашэнкі на прэзідэнцкіх выбарах вясной гэтага года супраць яго было заведзена больш за дзясятак крымінальных спраў. Экс-прэзідэнт, у прыватнасці, падазраецца ў дзяржаўнай здрадзе, злоўжыванні службовым становішчам, легалізацыі злачынных даходаў, нявыплаце падаткаў, спробе ўзурпацыі судовай улады.

## У Сенаце ЗША заявілі, што пры неабходнасці выканаюць правілы працэдуры імпічменту Трампа

Верхняя палата Кангрэса ЗША падпарадкуецца правілам і правядзе разбіральніцтва, калі ніжняя палата зацвердзіць абвінаваўчае заключэнне для адхілення Дональда Трампа ад пасады прэзідэнта краіны. Пра гэта заявіў у эфіры тэлеканала CNBC лідар рэспубліканскай большасці ў Сенаце Мітч Маконэл.

«У мяне не будзе іншага выбару, як дзейнічаць на падставе сенацкіх правілаў імпічменту», — дадаў рэспубліканец.

Як сцвярджаюць дэмакраты, Трамп у ходзе ліпеньскай размовы па тэлефоне спрабаваў пераканаць украінскага лідара Уладзіміра Зяленскага пачаць расследаванне дзейнасці ва Украіне сына былога амерыканскага віцэ-прэзідэнта Джозэфа Байдэна ў абмен на аказанне фінансавай і ваеннай дапамогі Кіеву. Дэмакрат Байдэн цяпер з'яўляецца найбольш верагодным канкурэнтам Трампа на маючых адбыцца ў лістападзе 2020 года прэзідэнцкіх выбарах. Таму, на думку дэмакратаў, Трамп, аказваючы ціск на Зяленскага, імкнецца з дапамогай Кіева пераабрацца на другі тэрмін.

# ЖЫЦЬ І СТАРЭЦЬ ГОДНА

**У гэтыя дні ў Мінску праходзіць міжнародны форум «Годнае даўгалецце», прымеркаваны да Міжнароднага дня пажылога чалавека. Удзел у ім бяруць прадстаўнікі дзяржаўных, грамадскіх, камерцыйных і акадэмічных арганізацый, эксперты ў галіне старэння насельніцтва, актыўныя пажылыя людзі — з Беларусі, Германіі, Аўстрыі, Расіі, Казахстана, Кыргызстана, Украіны.**

«Цяпер чалавецтва пераходзіць ад мадэлі з высокім узроўнем нараджальнасці і высокім узроўнем смяротнасці да мадэлі з нізкім узроўнем нараджальнасці і смяротнасці. Гэта сведчанне трыумфу аховы здароўя і палітыкі», — заявіў на адкрыцці форуму **Краінавы дырэктар ЮНФПА па Беларусі Хайме НАДАЛЬ.** І сапраўды, сучаснае развіццё Беларусі (і не толькі, гэта датычыцца ўсіх развітых краін) характарызуецца доўгатэрміновым і прагрэсуючым працэсам старэння насельніцтва. Цяпер кожны пяты жыхар нашай краіны з'яўляецца пажылым чалавекам. Згодна з дэмаграфічным прагнозам, у 2030 годзе пажылым будзе ўжо кожны чацвёрты беларус.

— Грамадства змяняецца — і змяняюцца нашы падыходы да вырашэння шматлікіх праблем, у тым ліку сацыяльных, — адзначае **намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Беларусі Аляксандр РУМАК.** — Тэндэнцыю старэння насельніцтва неабходна ўлічваць пры прыняцці рашэнняў ва ўсіх сферах жыццядзейнасці грамадства і на ўсіх узроўнях дзяржаўнага кіравання. Таму была распрацавана Нацыянальная стратэгія Рэспублікі Беларусь «Годнае даўгалецце — 2030». Для завяршэння работы над гэтым дакументам нам неабходна звярыцца з міжнароднымі рэкамендацыямі. Цяпер нам аказвае экспертную падтрымку рабочая група па старэнні Еўрапейскай эканамічнай камісіі ААН.

Варта адзначыць, што Нацыянальная стратэгія накіравана на ўсё насельніцтва нашай краіны, а не толькі на пажылых людзей, бо жыццёвы багаж, з якім мы ўваходзім у пажылы ўзрост, фарміруецца на працягу ўсяго нашага жыцця. А яе палажэнні павінны будуць улічвацца пры распрацоўцы праектаў дзяржаўных праграм на наступную пяцігодку.

**Арганізатары форуму — беларуская кааліцыя няўрадавых арганізацый «За годнае даўгалецце» і Міжнароднае грамадскае аб'яднанне «Узаемаразуменне».**

Акрамя праекта Нацыянальнай стратэгіі Рэспублікі Беларусь «Годнае даўгалецце — 2030», на форуме плануецца таксама абмеркаваць канцэпцыю дарожнай карты па забеспячэнні ўсебаковага ўліку праблем старэння ў Беларусі і ключавыя тэмы, якія датычацца жыцця пажылых людзей. Таксама адной з мэт форуму з'яўляецца вызначэнне прыярытэтаў сумеснай дзейнасці па стварэнні грамадства, у якім людзі жывуць і старэюць годна.

**Святлана БУСЬКО.**

**Кааліцыя «За годнае даўгалецце» была створана ў лістападзе 2018 года. Яе ўдзельнікі — прадстаўнікі васьмі некамерцыйных арганізацый, трох універсітэтаў залатога ўзросту, а таксама шэраг экспертаў, якія займаюцца рознымі кірункамі работы па паляпшэнні якасці жыцця пажылых людзей і забеспячэнні роўных магчымасцяў для людзей усіх узростаў.**

# Дранікам — пашана

У Магілёве прайшоў адмысловы фестываль

**Пачаставацца самай вядомай бульбяной стравай на этна-хутары «Зялёны гай» падчас Dranikfest арганізатары — Цэнтр гарадскіх ініцыятыў — запрашалі сёлета пяты раз. На свята смачнай ежы і добрага настрою штогод збіраецца некалькі тысяч гасцей.**



Па духмяныя дранікі — бясплатныя — стварaліся чэргі, якім мог пазайздросціць любы супермаркет. Наплыў гасцей тлумачыцца не толькі смакавымі патрэбамі, але і цікавымі спаборніцтвамі, майстар-класамі, выдатнымі фотазонамі, цудоўнай музыкай.

У батле па прыгатаванні «герояў» свята змагаліся шэсць камандаў, якія бадай што цэлы дзень завіхаліся, каб задаволіць падагрэтыя свежым паветрам і маляўнічымі краявідамі апетыты гасцей. Пераможцам стала «Мясарубка» — калектыў адной з магілёўскіх кампаній. Яны гавораць, што смажыць пачалі яшчэ аб 11-й гадзіне і скончылі толькі ў пяць.

— Мы любім удзельнічаць у розных мерапрыемствах, асабліва беларускіх. І заўзята падтрымліваем беларускую кухню, — кажа Анжэла Школьнік, дырэктар магілёўскай кампаніі «Метагарант», якая стала пераможцам фестывалю. — Два мяхі бульбы проста на рабоце абабралі напярэдадні фестывалю. А сёння ўжо з пяці раніцы па дамах надралі яе, каб была свежая. Што гэта за дранік, які гатаваўся ўчора!

Летась на дранік-фэсце расходавалі 6,5 тысячы аднаразовых талерак пад дранікі, па якіх і вёўся падлік пераможцаў. Сёлета набылі 10 тысяч, і іх не хапіла да канца фестывалю.

**Ірына СІДАРОК, фота аўтара.**

Транспарт

# БЕЗ ЧЭРГАЎ

**Беларусь і Літва прапрацоўваюць меры па прадухіленні ўтварэння чэргаў на граніцы, паведаміў першы намеснік міністра транспарту і камунікацый Аляксей ЛЯХНОВІЧ падчас адкрыцця Беларускага транспартнага тыдня.**

«Днямі адбылася сустрэча з літоўскай дэлегацыяй, дзе мы абмеркавалі шэраг кірункаў у сферы транспарту. На сённяшні дзень у нас засталося адно асноўнае пытанне, якое трэба вырашыць, — гэта чэргі на граніцы. Ёсць і канкрэтныя ідэі. Існуе крэдытнае пагадненне з Еўрапейскім інвестыцыйным банкам. З гэтым банкам мы плануем у межах рэканструкцыі аўтамабільнай дарогі М7 Мінск — Вільнюс правесці мадэрнізацыю пункта пропуску і значна павялічыць прапускную здольнасць», — сказаў Аляксей Ляхновіч.



Фота БелТА.

На выставе «Транспарт і лагістыка — 2019».

У выстаўцы «Транспарт і лагістыка — 2019» сёлета возьме ўдзел больш за 70 арганізацый. Сярод удзельнікаў выстаўкі транспартна-лагістычныя і экспедытарскія кампаніі, транспартна-лагістычныя цэнтры, вытворцы аўтатэхнікі, пастаўшчыкі абсталявання для аснашчэння лагістычных цэнтраў, адміністрацыі марскіх партоў і кіравання чыгунак з СНД, блізкага і далёкага замежжа. Акрамя індывідуальных стэндаў кампаній, у структуры экспазіцыі прадстаўлены калектыўны стэнд Латвіі, калектыўныя стэнды Клайпедскага порта і партовых кампаній і асацыяцый. Геаграфія ўдзельнікаў Беларускага транспартнага тыдня ахоплівае 11 краін свету (Беларусь, Расія, Украіна, Арменія, Літва, Латвія, Польшча, Аўстрыя, Швейцарыя, Італія, Кітай).

Насычаная дзелавая праграма Беларускага транспартнага тыдня ўключае пленарнае пасяджэнне і тэматычныя мерапрыемствы, на якіх айчынныя і замежныя эксперты прадставяць сучасныя тэхналагічныя рашэнні і паслугі ў галіне транспарту і лагістыкі. У ходзе тэматычных мерапрыемстваў будзе разгледжаны нацыянальны і сусветны вопыт развіцця транспартна-лагістычных сістэм, лічбавізацыі міжнародных кантэйнерных перавозак і кіраванне ланцугамі паставак.

У рамках Беларускага транспартнага тыдня ўпершыню будуць падведзены вынікі галіновага этапу конкурсу інавацыйных праектаў Belarus ICT StatUP Award'2020.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Здарэнні

# АКАЗАЎ ДАПАМОГУ ПАЦЯРПЕЛЫМ

І сам пасля быў збіты аўто

**У Слуцкім раёне прыблізна ў 21 гадзіну на 99-м кіламетры аўтадарогі Р23 Мінск — Мікашэвічы паблізу вёскі Васілінкі 72-гадовы жыхар Слуцка на Seat Inca, рухаючыся ў напрамку горада, не справіўся з кіраваннем аўто і наехаў на раздзяляльную агароджу.**

У выніку аварыі кіроўца і 55-гадовы пасажыр, прышпіленыя рамянямі бяспекі, атрымалі розныя цялесныя пашкоджанні. Абодва былі шпіталізаваны ў слуцкую бальніцу.

Тут жа ў гэты ж час адбылося і іншае здарэнне, паведамляе УУС Мінскага аблвыканкама. 48-гадовы жыхар раёна, які ехаў міма, убачыў аварыю Seat і спыніўся аказаць першую медыцынскую дапамогу пацярпелым. Пасля гэтага, перабягаючы дарогу назад да машыны, быў збіты Honda CR-V пад кіраваннем 45-гадовага жыхара раёна. Пацярпелага шпіталізавалі ў рэанімацыйнае аддзяленне бальніцы.

У сувязі з неспрыяльнымі ўмовамі надвор'я Дзяржаўтаінспекцыя рэкамендуе кіроўцам выконваць павышаныя меры асцярожнасці. Асабліва падчас дажджу, калі бачнасць зніжаецца. Пешаходам таксама неабходна выконваць правілы дарожнага руху і быць асабліва ўважлівымі пры пераходзе праезнай часткі.

# ЦЕПЛАВОЗ СЫШОЎ З РЭЕК

**Паведамленне ратавальнікам аб сходзе з рэек манеўровага цеплавоза на станцыі Магілёў-1 паступіла пасля васьмі гадзін раніцы.**

Калі падраздзяленні МНС прыбылі да месца выкліку, высветлілася, што на адным са стрэлачных пераводаў пры транспарціроўцы чатырох пустых пасажырскіх вагонаў адбыўся сход манеўровага цеплавоза. Прыблізна праз паўгадзіны пасля інцыдэнту сюды прыбыў аднаўленчы цягнік, які дыслакуецца на гэтай жа станцыі, для ліквідацыі наступстваў. Неўзабаве рух быў адноўлены. Пацярпелых няма, паведамілі ў МНС. Затрымка пасажырскага цягніка Магілёў — Мінск склала 29 хвілін.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

У нагу з часам

# НАВУКОВЫ РАСКЛАД: ЛАКАЦЫІ АКТЫЎНАСЦІ

**Да канца года ў Нацыянальнай акадэміі навук запланавана правядзенне звыш 80 мерапрыемстваў рэспубліканскага і міжнароднага ўзроўняў. Пра гэта расказала намеснік галоўнага вучонага сакратара Нацыянальнай акадэміі навук Наталля ЛІТВІНКА:**

— У Інстытуце жыллёва-камунальнай гаспадаркі 3-4 кастрычніка адбудзецца першая міжнародная канферэнцыя «Навукова-тэхнічны прагрэс у жыллёва-камунальнай гаспадарцы». У гэты ж дзень пачне работу II Кангрэс «Навука, харчаванне і здароўе», які рыхтуе Навукова-практычны цэнтр НАН Беларусі па харчаванні. Ахвотныя змогуць пазнаёміцца з новымі прысмакамі ад айчынных вытворцаў. На 10-11 кастрычніка запланавана міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Беларускія лекі», яе правядзе Інстытут біяарганічнай хіміі.

Апошні — гэта адзіная навуковая ўстанова ў краіне, якая выраблае лекі ад ідэі да выпуску на рынак. Сярод іх супрацьпухлінныя, супрацьзапаленчыя прэпараты, запатрабаваныя як у нашай краіне, так і за мяжой. У інстытуце ўпершыню быў створаны ўнікальны лекавы сродак «Лейкавір», які спыняе разбуральныя працэсы ў галаўным мозгу пры рассеяным склерозе.

Паспяховыя вынікі дасягнуты навукоўцамі і ў біятэхналагічнай галіне. Гэта заменнікі абястлушчанага малака, кармавыя дабаўкі, канцэнтраты для сельскай гаспадаркі і жывёл, вітамінна-мінеральныя сумесі, біяпестыцыды, вакцыны для прадухілення хвароб людзей і жывёл. Агульны аб'ём біятэхналагічнай прадукцыі да 2020 года дасягне аднаго мільярда рублёў.

Выступоўца адзначыла, што Нацыянальная акадэмія навук цяпер актыўна развівае касмічную галіну, біятэхналагічны сектар, электрамашынабудаўніцтва, а таксама інфармацыйныя тэхналогіі.

— Асаблівы гонар — выкарыстанне распрацовак нашых навукоўцаў у міжнародных касмічных праектах, такіх як даследаванне Марса і Меркурыя. У выніку буйных навукова-тэхналагічных распрацовак краіна ўвайшла ў сусветную эліту касмічных дзяржаў. Айчынныя распрацоўкі выкарыстоўваюцца і для асваення шостага кантынента планеты — Антарктыды. Дарэчы, сёлета восенню ў дванаццаты раз будзем адпраўляць чарговую экспедыцыю туды, — паведаміла Наталля Літвінка.

Цяпер Нацыянальная акадэмія навук развіваецца па тыпе навукова-вытворчай карпарацыі, дзе ў кожным інстытуце ствараецца патрэбная краіне прадукцыя. На базе 52 навуковых арганізацый функцыянуе 159 вытворчасцяў або вытворчых участкаў. За паўтара апошніх года створана 13 новых відаў навукаёмістай прадукцыі. Акцэнт робіцца на сферах бія-, нана-, фармацэўтычных тэхналогій. Таксама важным праектам на сёння з'яўляецца развіццё Міжнароднай асацыяцыі акадэмій навук (МААН).

Нацыянальная акадэмія навук усебакова падтрымлівае маладых навукоўцаў. Намеснік старшыні Савета маладых вучоных, загадчык аддзела археалогіі першабытнага грамадства Інстытута гісторыі Станіслаў ЮРЭЦКІ расказаў, што кожны год праводзяцца маштабныя мерапрыемствы, сярод якіх традыцыйныя свята «Фестываль навукі», што праходзіць у вясне, і канферэнцыя маладых вучоных «Моладзь у навуцы», якая сёлета пачнецца 14 кастрычніка.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**

# ГІСТОРЫЯ З «ВОДАРАМ»



Глеевая гаспадарка «Волма» — гэта 18 сажалак-адстойнікаў, на якіх захоўваюцца асадкі сцёкавых водаў.

**Жыхары прыстала́чча скардзяцца на выкіды ад гарадскіх сцёкаў. Ці ёсць рашэнне гэтай праблемы?**

**Ужо шмат гадоў жыхары дзясяткаў населеных пунктаў на паўднёвым усходзе ад Мінска пакутуюць ад непрыемных пахаў. Галаўны боль, млоснасць, прыгнечаны стан — толькі некаторыя з праяў суседства з глеевымі сажалкамі Мінскай ачышчальнай станцыі, гавораць тыя, каму «пашчасціла» на такое суседства. Каб вырашыць гэту праблему, грамадзяне звярталіся ў розныя інстанцыі, але нічога так і не змянілася. Людзі вырашылі аб'яднацца, склалі ініцыятыўную групу, якая і пачала шукаць выйсце ў розных інстанцыях. Справа дайшла і да звароту ў Адміністрацыю Прэзідэнта.**

**Па даручэнні Адміністрацыі ў аграгарадку Лугавая Слабада адбылася сустрэча насельніцтва з прадстаўнікамі адказных прадпрыемстваў і ведамстваў — Мінскводаканала, Мінскага вытворчага гарбарнага аб'яднання, Міністэрства аховы здароўя, НПЦ гігіены, Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя і яго тэрытарыяльных органаў, Мінскага абласнога і гарадскога камітэтаў прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, Мінскай цэнтральнай раённай бальніцы. На сустрэчы папрысутнічала і карэспандэнт «Звязды».**

## ГЛЕЙ І САЖАЛКІ

Мінская ачышчальная станцыя была ўведзена ў эксплуатацыю на пачатку 1960-х гадоў. На працягу некалькіх дзесяцігоддзяў гаспадарча-бытавыя і прамысловыя сцёкі, што ўтвараюцца на тэрыторыі сталіцы, паступаюць у гэты комплекс.



На сустрэчы ў Лугавой Слабадзе прысутнічалі прадстаўнікі УП «Мінскводаканал», а таксама арганізацый і ўстаноў, падначаленых Мінздароўя і Мінпрыроды.

Пасля ачысткі сцёкі трапляюць у раку Свіслач, а глей складзіруецца на спецыяльных сажалках, размешчаных недалёка ад вёскі Сіняло Мінскага раёна. Менавіта апошнія аб'екты і сталі каменем спатыкнення мясцовых жыхароў з УП «Мінскводаканал» і ведамствамі, адказнымі за стан наваколля і здароўе насельніцтва.

Сёння глеевая гаспадарка «Волма» — гэта 18 сажалак-адстойнікаў, на якіх захоўваюцца асадкі сцёкавых водаў. Апошняя сажалка была ўведзена ў эксплуатацыю сёлета. Па словах грамадзян, пахі нечыстот распаўсюджваюцца ад пляцоўкі на цэлыя кіламетры, вымушаючы жыхароў Сіняла, Міханавічаў, Прывольнага, Гатава, Мачулішчаў і іншых населеных пунктаў хавацца ў сваіх дамах, шчыльна зачыняючы дзверы і вокны нават у спёку.

Мясцовыя жыхары таксама кажуць пра тое, што смурод шкодна ўплывае на здароўе як дарослых, так і дзяцей, а школы, што размешчаны ў вобласці ўздзеяння сажалак, уваходзяць у топ-10 самых хварэючых школ Мінскага раёна.

## ПАХ ЁСЦЬ — ШКОДЫ НЯМА?

Ці можа пры такім стойкім удушлівым смуродзе быць добры стан наваколля? «Пры адпаведнасці гранічна дапушчальных канцэнтрацый шкодных рэчываў у атмасферным паветры наваколле з'яўляецца бяспечным і спрыяльным», пачулі жыхары гэтага самага наваколля ў адказ. Спецыялісты кажуць пра тое, што ў пробах паветра, якія адбіраюцца побач з сажалкамі, у большасці не зафіксавана перавышэнняў ГДК, а наяўнасць некаторых проб з перавышэннямі звязана з часовымі фактарамі. Пры гэтым яны згаджаюцца з мясцовымі жыхарамі, што непрыемны пах прысутнічае нават у тых выпадках, калі якасць паветра па выніках іх даследаванняў адпавядае нарматывам. Што ж тады яго выклікае, калі не шкодныя рэчывы, і як можна хутка пазбавіцца ад невыноснага смуроду?

Начальнік вытворчасці «Мінскачыствод» УП «Мінскводаканал» Андрэй Герасімчык расказаў, што для вырашэння праблемы непрыемнага паху на адной з глеевых сажалак цяпер праводзіцца навукова-даследчая работа — вывучаецца магчымасць яе рэкультывацыі, у тым ліку высаджваюцца саджанцы дрэў, аналізуецца іх прыжывальнасць. Праўда, мясцовыя жыхары вельмі скептычна аднесліся да такога варыянту рашэння іх праблемы — на іх думку, каб дрэвы сёння сапраўды абаранялі ад шкодных рэчываў, іх трэба было пасадзіць значна раней, тым больш што многія з саджанцаў дрэнна прыжываюцца.

Яшчэ з пачатку 2000-х гадоў цягнецца справа і з магчымай рэканструкцыяй Мінскай ачышчальнай станцыі. Згодна з апошнімі данымі, увесь праект павінен быць рэалізаваны да 2025 года, а канкрэтна будаўніцтва комплексу збудаванняў па ўтылізацыі асадкаў — у 2023 годзе. А да гэтага часу глей па-ранейшаму будзе захоўвацца на сажалках-адстойніках. Прадпрыемства таксама выпрабоўвае ўстаноўку для нейтралізацыі пахаў. Але сказаць дакладна, наколькі эфектыўна яна будзе працаваць на сажалках, па словах прадстаўнікоў «Мінскводаканала», яшчэ немагчыма.



Ад «водару» глеевых сажалак пакутуюць жыхары некалькіх населеных пунктаў.

Пакуль гэтага не адбылося, ініцыятыўная група настойвае на тым, каб хоць бы аператыўна атрымліваць інфармацыю аб якасці атмасфернага паветра ў раёне сажалак. Сёння за яго станам сочаць спецыялісты Мінскводаканала і санітарныя службы — перыядычна іх лабараторыі праводзяць адбор проб. Але такія праверкі, на думку мясцовых жыхароў, не могуць аб'ектыўна адлюстраваць сітуацыю — патрэбна пастаянна (кругласутачна) рабіць замеры, што можна рэалізаваць толькі дзякуючы стацыянарнаму пасту.

Кіраўніцтва Мінскводаканала ў адказ на заклікі грамадскасці пагадзілася разгледзець пытанне закупкі такога паста. Але падчас сустрэчы не было агучана, ці будзе прадпрыемства дакладна яго набываць. Па словах начальніка аддзела экалогіі і развіцця УП «Мінскводаканал» Вольгі Зайцавай, пакуль збіраецца інфармацыя пра абсталяванне, якое можа ўвайсці ў склад пункта, і патрабаванні да яго ўстаноўкі.

Мясцовыя жыхары выказалі незадаволенасць такім марудным развіццём падзей. Яны ўпэўнены — гэта пытанне, улічваючы яго актуальнасць і сацыяльную напружанасць, неабходна і можна вырашыць значна хутчэй.

Члены ініцыятыўнай групы таксама пацікавіліся, чаму да гэтага часу не праведзена ацэнка рызыкі здароўю насельніцтва, якую павінны былі правесці перад будаўніцтвам 18-й сажалкі. Прадстаўнік УП «Мінскводаканал» растлумачыла: цяпер на прадпрыемстве ідзе інвентарызацыя выкідаў забруджвальных рэчываў. Па яе выніках будуць разлічваць санітарна-ахоўную зону і праводзіць ацэнку рызыкі. Актывісты ў адказ звярнулі ўвагу на неабходнасць уключыць у склад выкідаў і адпаведна ў далейшым вымяраць падчас маніторынгу такія рэчывы, як фармальдэгід і меркаптаны, якія, на іх думку, моцна ўплываюць на інтэнсіўнасць «водару» з сажалак.

## ПЫТАННІ ЗАСТАЮЦЦА

Падчас сустрэчы прадстаўнікі грамадскасці былі незадаволеныя некаторымі адказамі спецыялістаў, лічылі іх неканкрэтнымі, насычанымі складанай тэрміналогіяй, выказвалі сумнеў, што з боку дзяржорганаў сапраўды робіцца ўсё магчымае, каб вырашыць праблему. Удзельнікі сустрэчы недаверліва аднесліся да выказванняў прадстаўнікоў дзяржарганізацый, што зафіксаваныя перавышэнні ГДК непасрэдна не звязаныя з дзейнасцю Мінскай ачышчальнай станцыі і сажалак-адстойнікаў; што зліў свежага глею ў старыя сажалкі (з'яўляецца парушэннем) быў толькі разавы; што ў цёмны час сутак на аб'екце не праводзіцца ніякая работа (менавіта вечарамі і нават ноччу мясцовыя жыхары часта адчуваюць вельмі моцны пах).

Чаму актыўныя дзеянні па рэкультывацыі глеевых пляцовак, якія існуюць яшчэ з 1970-х гадоў, ажыццяўляюцца толькі цяпер, нягледзячы на тое, што многія з гэтых аб'ектаў былі запоўненыя дастаткова даўно? Чаму для ўтылізацыі асадкаў сцёкавых водаў не шукаліся і не шукаюцца больш экалагічныя варыянты? Такія пытанні таксама гучалі падчас сустрэчы ад ініцыятыўнай групы.

Акрамя дзейнасці Мінскай ачышчальнай станцыі гаварылі і пра планы Мінскага вытворчага гарбарнага аб'яднання, што знаходзіцца ў Гатаве. У пачатку 2019 года праходзілі грамадскія абмеркаванні наконт будучага будаўніцтва адстойніка для гарбарнага прадпрыемства побач з глеевымі пляцоўкамі Мінскводаканала. Грамадскасць выступіла супраць такога спосабу ўтылізацыі адходаў. На сустрэчы галоўны інжынер завода Юрый Вакалюк расказаў, якія варыянты сёння распрацоўваюцца для вырашэння праблемы: шукаецца альтэрнатыўны ўчастак для магчымага будаўніцтва; адначасова прапрацоўваецца варыянт будаўніцтва закрытага аб'екта, «з якога не будзе выкідаў»; разглядаюцца прапановы арганізацый наконт новых спосабаў утылізацыі такіх адходаў, і ўжо рэалізуецца адзін з такіх пілотных праектаў; тэрыторыя каля сажалак апрацоўваецца спецыяльнымі рэчывамі, якія павінны зменшыць інтэнсіўнасць паху.

**У пачатку 1990-х гадоў на сесіі Лугаваслабадскога сельскага Савета вёскі Сіняло, Вясёлкі, Калодзежкі былі абвешчаны зонай экалагічнага бедства, якое ўзнікла ў выніку функцыянавання аварыйнай глеевай гаспадаркі (сажалак), што належаць прадпрыемству «Мінскводаканал». У 1996 годзе такое ж рашэнне было прынята і для мікрараёна Шабаны, вёскі Малы Трасцянец і пасёлка Сосны.**

Жыхары падчас сустрэчы не раз падкрэслівалі — усе тыя мерапрыемствы, што сёння праводзяцца на Мінскай ачышчальнай станцыі і глеевай гаспадарцы, павінны былі быць выкананы яшчэ некалькі гадоў, калі не дзесяцігоддзяў таму. Тым больш што чакаць станоўчых эфектаў ад іх правядзення можна яшчэ доўга.

А рашаць праблему трэба. Хоць бы таму, што яна ўзнікла і працягвае існаваць побач са сталіцай еўрапейскай дзяржавы.

**Вераніка КОЛАСАВА.**

Падрабязнасці

# Няўдачлівы дзівінскі Атэла

## Заведзена крымінальная справа па факце выкрадання дзяўчыны

**У Брэсце здзейснена дзёрзкае злачынства, якое Крымінальны кодэкс кваліфікуе як выкраданне чалавека. Сваю былую дзяўчыну 29-гадовы мужчына сілком зацягнуў у багажнік машыны, а потым яшчэ і збіў драўлянай бітой.**

Гэта крымінальная драма пачалася а палове дзявятай раніцы. Выкрадальнік чакаў сваю ахвяру каля пад'езда яе дома. І як толькі яна выйшла на ганак, адразу схапіў яе, скруціў, запхнуў у багажнік машыны. Відавочцам нападу стаў дворнік, які працуе ў тым раёне, але ўмяшацца не паспеў. Зламыснік вельмі хутка з'ехаў з месца здарэння, але дворнік запомніў нумар машыны і пазваніў у міліцыю. Крыху пазней сама выкрадзеная здолела патэлефанаваць з багажніка на лінію 102 і сказаць, хто яе выкраў. Праўда паведаміць, куды вязе яе былы кавалер, не магла, бо не ведала.

Арыентуючыся на тыя звесткі, якія паведаміла ахвяра пра свайго выкрадальніка, міліцыянеры ўвялі план «Перахват» на тэрыторыі Жабінкаўскага, Кобрынскага, Бярозаўскага раёнаў.

— Затрымаць зламысніка ўдалося ў вёсцы Бусні Жабінкаўскага раёна, — пракаментавала **прэс-сакратар МУС краіны Вольга ЧАМАДАНАВА.** — Выкрадальнікам аказаўся былы хлопец 21-гадовай дзяўчыны, супрацоўніцы аднаго з банкаў Брэста.

Як стала вядома пазней, жыхары вёскі Бусні дапамаглі затрымаць зламысніка. Там ён з нейкай прычыны спыніў машыну, дзяўчыне ўдалося выбрацца з багажніка, яна кінулася наўцёкі, але ён дагнаў і ўдарыў некалькі разоў бітой па галаве. Мясцовы трактарыст умяшаўся ў канфлікт, тым часам пад'ехала міліцыя, і хулігана звязалі.

Дзяўчыну адвезлі ў Жабінкаўскую раённую бальніцу і пасля неабходных абследаванняў шпіталізавалі.

Як высветлілася пазней, дзёрзкі выкрадальнік — жыхар вёскі Дзівін Кобрынскага раёна. Ён рос сіратой, бацькі загінулі ў аўтакатастрофе. Раней ездзіў на заробкі ў Маскву, зараз нідзе не працуе, з законам да гэтага праблем не меў. Дзяўчына таксама з гэтай вёскі. Пасля заканчэння ўніверсітэта выйшла на работу ў адну з фінансавых устаноў абласнога цэнтра. Яны раней сустракаліся, але потым адносіны разладзіліся.

За выкраданне чалавека фігуранту справы пагражае пазбаўленне волі да сямі гадоў. Як паведамілі ў Брэсцкім міжраённым аддзеле СК, праводзяцца ўсе неабходныя следчыя дзеянні.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# Сто гадоў на дваіх

## АЛІГАРХІ ДА НАС НЕ ЕДУЦЬ

Гэта ж не смешачкі, сто гадоў працоўнага стажу на дваіх! І якія тут сакрэты працоўнага даўгалецця — яны абое ўвесь час у рабоце. Нават пагутарыць давялося з кожным паасобку на рабочым месцы ў перапынках паміж пацыентамі. Бо аддзяленні, у якіх яны працуюць, знаходзяцца ў розных будынках на прыстойнай адлегласці.

Першае, што давялося пачуць у сельсканканме, калі зайшла адзначыць камандзіроўку: «Мы не ўяўляем сабе, дзе будзем лячыцца, калі Віктар Уладзіміравіч сыдзе на пенсію. Да яго ж з усёй акругі едуць». Ну і праўда. У калідоры стаматалагічнага аддзялення сядзела немалая чарга пацыентаў. Мясцовых, антопальскіх, была жменька, астатнія з Бярозаўскага, Кобрынскага раёнаў, а таксама з названых райцэнтраў. Здавалася б, немалыя гарады Бяроза і Кобрын, там усе паслугі артапедычнай стаматалогіі аказваюць на месцы. Але ж людзі едуць. Аўтару гэтых радкоў пенсіянер з вёскі Маравіль Бярозаўскага раёна Міхаіл Макарэвіч сказаў так: «Шмат гадоў езджу да гэтага доктара, бо ён робіць якасна па ўмеранай цане».

— Алігархі да нас не едуць — смяецца Віктар Уладзіміравіч. — Вось такія пацыенты найбольш, як Міхаіл Пятровіч, вясковыя, у гадах. У нас нават сезоннасць наплыву праглядваецца ў залежнасці ад ходу сельгасработ. Як бульбу выкапалі, то актыўнасць шматкроць узрастае, запіс на некалькі тыдняў наперад, а ў самы пік сяўбы і ўборкі наведвальнікаў у калідорах прыкметна менее.

**«І я з зубным тэхнікам сталі першымі слухачамі тых курсаў. З мяне садралі два з паловай мільёны за трохтыднёвы курс навучання. Для параўнання, за паўгода да гэтага «Жыгулі» каштавалі прыкладна 800 тысяч, і якая б ні была інфляцыя, гэта былі, згадзіцеся, немалыя грошы».**

А яшчэ таму, відаць, любяць пацыенты свайго доктара, што камунікуе з імі весела, з гумарам, чалавек выходзіць ад доктара з яўна прыўзнятым настроем. Некалі пры першым візіце памянёнага Міхаіла Макарэвіча ўрач паставіў яго ў тупік пытаннем: «Што я табе павінен?» Міхаіл Пятровіч аж разгубіўся, бо падсвядома сам рыхтаваўся задаць падобнае пытанне ў канцы, таму сказаў: «Нічога».

Віктар Уладзіміравіч таксама згадаў той выпадак і патлумачыў, што яму трэба ведаць, якія зубы хоча мець пацыент пасля курса лячэння. Дадам, што ўсіх мужчын ён жартоўна называе дзядзькамі, а жанчын — дзевачкамі. Напрыклад: «Прыйшоў дзядзька, кажа: «У мяне палюбоўніцы няма, зрабі, каб было можна нармальна есці». А прыйшла дзевачка, гаворыць: «Я хоць і на пенсіі, але мне важна, каб было прыгожа». Патрэбы пацыента абумоўліваюць выбар матэрыялу і аб'ём работы».

— А калі сур'ёзна, — працягвае доктар — то ў савецкія часы 1 рубель 70 капеек каштавала металічная каронка, 2 рублі 50 капеек была цана на пратэзаванне зуба.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

І нават санітарка, прыбіральшчыца, то-бок чалавек з мінімальнай зарплатай у 70 рублёў, мог сабе дазволіць прыстойныя зубы. А цяпер, вы ж ведаеце, усё памянялася. Дык вось наша гаспадарчаразліковае падраздзяленне пры дзяржаўнай медыцынскай установе існуе для таго, каб гэтым людзям артапедычная стаматалогія была даступная. Бачыце, савецкі белы халат нашу, савецкія падыходы маю, позна мне мяняцца.

## ЗБІРАЛІ ЎСЁЙ АКРУГАЙ

Але насамрэч Віктар Еніч вельмі нават сучасны чалавек і ў пачатку 90-х гадоў паказаў сябе здольным менеджарам, таленавітым арганізатарам, калі паўстала пытанне захаваць гэты кабінет у Антопалі, дакладней, выратаваць яго. Вось яго расповед за значнымі скарачэннямі пра той час:



**Віктар Уладзіміравіч і Вера Міхайлаўна на рабочых месцах.**

«У 80-х гадах сфарміраваўся калектыў, прыйшлі на работу зубныя тэхнікі. Тады грошай было дастаткова — абсталяванне купіць было праблемай. А потым насталі 90-я, з'явілася абсталяванне ў розных камерцыйных структурах, але ўзнікла новае пытанне: дзе ўзяць грошы? Добра памятаю 1992 год. Рубля савецкага няма, першыя «зайцы і вавёркі», за іх за межамі краіны нічога не купіш, ды і тых бракуе.

Я прыкінуў, што грошы ўсё ж трэба знайсці, бо калі не будзе на чым працаваць, то кабінет закрыецца аўтаматычна. І пайшоў, як той казаў, з шапкай па сваіх пацыентах. Адгукнуліся старшыні калгасаў, банкіры, якія раней лячыліся ў нас. Крыху пазней падобнае спонсарства забаранілі. А тады я сумеў скарыстацца. Мы заключалі дагавор з прадпрыемствам альбо арганізацыяй, што кабінет абавязуецца прымаць работнікаў установы ў першую чаргу, а за гэта яны выдзяляюць пэўную суму грошай. Калгасы давалі па 20—25 мільёнаў першых беларускіх рублёў, банкі па 70 мільёнаў, адно кобрынскае прадпрыемства выдзеліла 90 мільёнаў. Так паступова мы сабралі патрэбную для закупкі абсталявання суму.

А потым перада мной кампетэнтныя людзі паставілі такое пытанне: «Ты атрымаў дзяржаўныя грошы. А ў цябе ёсць спецыялісты, якія будуць працаваць на новым абсталяванні?» Гаворка ішла аб вырабе металакерамікі. Пры Саюзе асноўнымі цэнтрамі падрыхтоўкі спецыялістаў па металакераміцы былі Масква, Харкаў, Ленінград, Іркуцк. Гэтыя гарады з вядомых прычын не маглі разглядацца як адрасы нашай падрыхтоўкі, бо грошай, сабраных на абсталяванне, хапіла б хіба на курсы. Даведаўся, што ў маёй роднай альма-матар сталі чытаць лекцыі па металакераміцы студэнтам пятага курса. Але ж як трапіць на тыя лекцыі мне ды яшчэ зубному тэхніку, не ўяўляю. У міністэрстве ад мяне адмахваліся, нібы ад надакучлівай мухі.

## ПЕРШЫЯ ПЛАТНЫЯ КУРСЫ

Скончылася тым, што ў парадку выключэння пры кафедры артапедычнай стаматалогіі медінстытута стварылі гаспадарчаразліковыя курсы. І я з зубным тэхнікам сталі першымі слухачамі тых курсаў. З мяне садралі два з паловай мільёны за трохтыднёвы курс навучання. Для параўнання, за паўгода да гэтага «Жыгулі» каштавалі прыкладна 800 тысяч, і якая б ні была інфляцыя, гэта былі, згадзіцеся, немалыя грошы. Я не мог іх нідзе знайсці. Такім чынам над вынікамі ўсёй аграмаднай работы па зборы сродкаў на абсталяванне навісала пагроза. У раённым і абласным упраўленнях аховы здароўя адмовіліся аплаціць вучобу, бо самі былі на картатэках.



І вось аднойчы, седзячы дома вечарам у стане блізкім да роспачы, вырашыў пазваніць старшыні райвыканкама, якога раней і не ведаў асабіста. У тую пару Драгічынскі райвыканкам узначальваў Антон Сцяпанавіч Стэльмах. Ён выслухаў і стаў сварыцца: «Чаму я да гэтай пары не ведаю пра ўвесь гэты твой праект!? — і далей — Куды грошы пералічваць? Заўтра табе прывязуць копію плацежнага дакумента і хутчэй едзь на курсы! Людзі павінны атрымліваць стаматалагічную дапамогу». Вось так мы падвучыліся, потым купілі абсталяванне. Печ ліцейную набылі на Падольскім ваенным заводзе. На ёй працуем і зараз, некалькі разоў даводзілася яе рамантаваць. Знайсці спецыялістаў для рамонту вылівалася ў цэлую эпапею. Але ж калі захацець, можна адшукаць добрых майстроў і ў нас.

Так і працуем з нашымі зубнымі тэхнікамі Ірынай Ігнацюк, Святланай Данілавай, Таццянай Мароз. Вядома, прыбытку асаблівага наш кабінет не дае, у эканоміцы свайго гаспадарчаразліковага падраздзялення прыблізна выходзім на нуль. Я нават дакладна не магу сказаць, акупілася гэта абсталяванне за столькі гадоў ці не. Ніхто не лічыў. Тады аддалі 206 мільёнаў тых «зайцоў і вавёрак». Ёсць сэнс гаварыць аб сацыяльнай накіраванасці артапедычнай стаматалогіі ў Антопалі. Як я ўжо казаў, алігархі да нас не ходзяць...

Але ж вось гэтых «не алігархаў» на прыёме бывае столькі, што калі мы са старшынёй сельскага Савета заехалі ў пяць вечара дадому да Енічаў у спадзяванні зрабіць іх сямейны здымак, Віктара Уладзіміравіча яшчэ не было дома, хоць працоўны дзень яго даўно скончыўся. Дома была толькі гаспадыня.

## ВЕРА МІХАЙЛАЎНА

Яна, ураджэнка горада Таропец цяперашняй Цвярской вобласці, прыехала некалі ў Мінск вучыцца. На чацвёртым курсе пазнаёмілася з Віктарам, стварылі сям'ю. Дачка нарадзілася ў іх яшчэ падчас вучобы. Тады размеркаванне было саюзным, і калі ім прапанавалі пасялковую бальніцу ў Антопалі, побач з Драгічынам, малой радзімай Віктара Уладзіміравіча, то яны без асаблівага роздуму згадзіліся. Прыехалі, 1 жніўня 1969 года прыступілі да работы. Тут сям'і выдзелілі дом. Пазней яны яго добраўпарадкавалі і выкупілі ва ўласнасць. Так і працуюць усе 50 гадоў.

— Былі прапановы ў розны час пераязджаць — згадвае Вера Міхайлаўна. — Аднойчы на курсах мужу давалі работу ў Мінску, ну і я, вядома, не засталася б у сталіцы без работы. Але кожны раз пры такіх прапановах узнікалі розныя абставіны. То дзецям заставалася трошкі, каб школу скончыць, то трэба было іх вучыць, то з унукамі дапамагаць, куды ж без жылля зрывацца з месца? А потым ужо прывыклі, за столькі гадоў усё стала сваім. Дзеці жывуць недалёка, дачка — у Брэсце, сын — у Кобрыне.

Дзеці Енічаў выбралі іншыя спецыяльнасці, а вось унучкі прадоўжылі медыцынскую дынастыю, адна ўжо скончыла медуніверсітэт і працуе, другая вучыцца на старэйшых курсах.

Ды і ўсе людзі іх ведаюць, яны ўсіх у акрузе — таксама. Пачынала Вера Міхайлаўна ўрачом радзільнага дома пры Антопальскай бальніцы, якая мела статус другой раённай. Цяперашнія жыхары населенага пункта і ваколіцы, маладзейшыя за 50, ледзь не ўсе прайшлі праз яе рукі. Потым дапамагала з'явіцца на свет і дзецям тых, каго прымала ў першыя гады работы. Цяпер Вера Еніч працуе як участковы гінеколаг, у яе назіраюцца жанчыны не толькі з Антопаля, але навакольных вёсак і нават суседніх сельсаветаў.

**«У савецкія часы 1 рубель 70 капеек каштавала металічная каронка, 2 рублі 50 капеек была цана на пратэзаванне зуба. І нават санітарка, прыбіральшчыца, то-бок чалавек з мінімальнай зарплатай у 70 рублёў, мог сабе дазволіць прыстойныя зубы. А цяпер, вы ж ведаеце, усё памянялася. Дык вось наша гаспадарчаразліковае падраздзяленне пры дзяржаўнай медыцынскай установе існуе для таго, каб гэтым людзям артапедычная стаматалогія была даступная».**

Некалі, згадвае Вера Міхайлаўна, прыехала ў Мінск, мовы беларускай не разумела: «Хлопец аднойчы прапускае наперад у чытальнай зале са словамі «калі ласка», а я здзіўлена абарочваюся, не ведаю, што ён кажа. А цяпер добра разумею і беларускую мову, і мясцовую палескую гаворку. На жаль, сама гаварыць як след па-беларуску не навучылася. Затое муж і па-беларуску, і па-мясцоваму добра гаворыць».

## СЯМ'Я

Калі галава іхняй сям'і аддае перавагу актыўнаму адпачынку, захапляецца паляваннем, рыбалкай, з задавальненнем даглядае кветнік і агарод, то яна — класічная захавальніца дамашняга ачага — больш шчыруе па хатняй гаспадарцы. А вось падчас водпуску абавязкова стараюцца недзе выязджаць. Раней часцей выбіраліся на мора, на курорты. Цяпер плануюць паездкі крыху бліжэйшыя. Амаль штогод стараюцца пабываць у яе родным Таропцы. Гарадок параўнальны з Драгічынам па насельніцтву, але славуты сваімі цэрквамі і помнікамі даўніны. «На кожнае свята была свая царква, — расказвае Вера Міхайлаўна. — Прыгожы горад, хоць і невялікі. Там цяпер нас чакаюць адны магілы. Заязджаем, звычайна спыняемся ў былых суседзяў, даглядаем магілы, ды і назад. Мама ў мяне апошнія гады жыла ў Антопалі, але папрасіла пахаваць на радзіме, побач з бацькам. Вядома, мы просьбу выканалі. Ну а мы ўжо — тутэйшыя. Нікуды з'язджаць не збіраемся. Пакуль сябе даглядаем, грошы для сябе зарабляем, унукам дапамагчы можам сабе дазволіць... Вядома, узнікаюць думкі, што можна было б і завяршаць працоўную дзейнасць, але ж прывыклі ўжо, відаць, сумна будзе, некамфортна. На год кантракт мне падпісалі, а там будзе відаць».

Так і жывуць сельскія ўрачы Енічы, чый працоўны стаж у суме складае сто гадоў на адным месцы. І калі Віктар Уладзіміравіч увасабляе сабой хуткасць, імклівасць, рух, то Вера Міхайлаўна — спакой, памяркоўнасць, развагу і тым самым, пэўна, ураўнаважвае энергічнасць мужа, што так патрэбна для сямейнай гармоніі.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

*Драгічынскі раён.*

## Zамор'е

### ШАТЛАНДКА 24 ГАДЫ ЖЫВЕ З НЯЗГРАБНЫМ МУЖАМ

**Жыхарка шатландскага горада Эдынбурга сцвярджае, што ў яе самы нязграбны муж у Вялікабрытаніі. Яна расказала пра яго шматлікія няўдачы выданню Daily Mail.**



«Крэйг — гэта хадзячая катастрофа, — сцвярджае 55-гадовая Дэбі Сцівенс. — Усё, да чаго ён дакранаецца, ператвараецца ў пыл. Я ў жыцці не сустракала больш нязграбных людзей». Нягледзячы на гэта, іх шлюб працягваецца ўжо 24 гады.

Праз год пасля вяселля муж падарваў духоўку, па няўважлівасці падлучыўшы правады да раздымаў не таго колеру. Каб хутчэй размарозіць халадзільнік, Сцівенс паклаў у яго электраабагравальнік і растапіў пластык. Здымаючы ўпаковачную плёнку з новай канапы, Крэйг распароў нажом яе абіўку. Новы ложак ён сапсаваў, неспадзявана перакуліўшы на яго слоік з фарбай. Устаноўка рэгулятара асвятлення скончылася тым, што згарэлі ўсе асвятляльныя прыборы ў доме, а ўборка — пабітым экранам тэлевізара.

Паводле слоў Дэбі, аднойчы Крэйг умудрыўся разбіць прыпаркаваны аўтамабіль, седзячы на пасажырскім месцы. Гэта адбылося, калі яна адлучылася ў прыбіральню. «Потым выходжу на вуліцу і бачу, што машына ўрэзалася ў сцяну рэстарана і прарабіла ў ёй вялізную дзірку, — расказвае жанчына. — Мяне ўзяў жах. На шчасце, ніхто не пацярпеў». Як высветлілася, муж пацягнуўся да магнітолы, каб памяняць станцыю, і выпадкова крануў ручны тормаз. У выніку аўтамабіль пакаціўся з пакату.

### У ГАТЭЛІ ДАЗВОЛІЛІ ЛАМАЦЬ МЭБЛЮ І ТЭЛЕВІЗАРЫ

**Адна з турэцкіх гасцініц дазволіла сваім пастаяльцам біць посуд, тэлевізары, камп'ютары і ламаць мэблю, паведамляецца на сайце Асацыяцыі тураператараў Расіі (АТОР).**



Па звестках АТОР, гасцініца, якая знаходзіцца ў Аланьі, абсталявала спецыяльныя пакоі лютасці, дзе парапранутыя ў спецыяльную ахоўную адзежу пастаяльцы змогуць руйнаваць усё, што захочуць, — ад бутэлек да мэблі ды рознай бытавой і камп'ютарнай тэхнікі. Такім чынам госці могуць зняць стрэс ці проста разнастаіць свой адпачынак. У гатэлі расказалі, што пакоі карыстаюцца найбольшай папулярнасцю ў мужчын ад 18 да 38 гадоў, у асноўным у бізнесменаў і прагматыкаў. Часцей за ўсё іх наведваюць турысты з Германіі, скандынаўскіх краін, Вялікабрытаніі і Нідэрландаў.

### ХЛАПЕЧНІК АБЫШОЎСЯ ЖАНІХУ ДАРАЖЭЙ ЗА ВЯСЕЛЛЕ

**Жыхар амерыканскага горада Лаўленд, што ў штаце Каларада, атрымаў рахунак на некалькі тысяч долараў за лячэнне пахмелля пасля хлапечніка, паведамляе партал topnews.ru.**




30-гадовы Кэмеран Фішэр адчуваў сябе пасля хлапечніка настолькі дрэнна, што нявеста прымусіла яго пайсці да ўрача. Мужчына звярнуўся ў найбліжэйшае кругласутачнае аддзяленне неадкладнай дапамогі. Там не было пацыентаў, дзяжурылі толькі ўрач і пара медсясцёр. Фішэр расказаў ім, што пакутуе ад моцнага пахмелля, і растлумачыў, што рэдка ўжывае алкаголь і ніколі не прымаў наркотыкі. Медсястра дала яму дзве дозы фізрастовру і дозу лекаў ад млосці. Таксама яна ўзяла кроў на аналіз. Праз 45 хвілін Фішэр выйшаў з аддзялення і адчуваў сябе значна лепш.

Праз некалькі тыдняў пасля вяселля амерыканец атрымаў рахунак на 12,5 тысячы долараў. Гэтая сума ўдвая перавысіла выдаткі на вяселле. «Хлапечнік выйшаў залішне дарагі», — жартуе амерыканец.

**Іван КУПАРВАС.**

## Спытайце пра радзіннае

# КОЛЬКІ РАЗОЎ МОЖНА БЫЦЬ ШАФЕРАМ?

***Т. В. Нікіціч з Бярозаўскага раёна пытаецца: «Ці праўда, што шаферам або шаферкай на вяселлі можна быць толькі адзін раз?»***

У структуры беларускага традыцыйнага вяселля роля шафера і шаферкі была найбольш важкай на працягу ўсяго святочнага дзейства, пачынаючы ад выкупу нявесты. У некаторых рэгіёнах Беларусі менавіта старэйшаму шаферу давяралі кіраваць вяселлем. Ад яго ўмення гаварыць, жартаваць, ад яго ведаў абрадаў і рытуалаў залежала, наколькі ўдала пройдзе вяселле.

Вельмі негатыўна ставіліся да тых сябрукоў, якія за вясельным сталом забывалі пра свае абавязкі:

*Звязалі дружка, звязалі!*
*А дзе ж яго паймалі?*
*Запіўся шафера, запіўся!*
*І на дружыну забыўся!*

Такім чынам, сфармулюем некалькі рэгламентацый, якія датычыліся шафера і шаферкі. Дружак, шафераў або ганаровых сведак выбіралі з самых блізкіх сяброў. Пры гэтым неабходна ведаць, што такую **ганаровую ролю на вяселлі можна выканаць толькі адзін раз у жыцці,** каб потым своечасова стварыць сям'ю. У адваротным выпадку вы можаце нашкодзіць самому сабе — «застацца» шаферам назаўжды.

«Калі дзеўка ўжо была два разы дружкаю, то як яе прасяць, то павінна адказаць, бо ўжо больш ніяк няможна», — неадназова чулі мы ад старых людзей падчас нашых экспедыцый.

**Шаферам і шаферкай маглі быць толькі незамужнія / нежанатыя маладыя людзі, якія не маюць дзяцей.** З'яўляючыся прадстаўнікамі адпаведна радзіны жаніха або нявесты, на вяселлі шафер займаў ганаровае месца каля жаніха, шаферка — каля нявесты: «Каля жаніха становіцца яго старшы шафер, каля нявесты — яе старэйшая шаферка, усе астатнія — ззаду».

**На працягу ўсяго вяселля шафер і шаферка павінны быць звязвальным звяном паміж маладымі і ўдзельнікамі вясельнага застолля. Іх абавязак — ахоўваць маладых ад другасных кантактаў з удзельнікамі вяселля, дапамагаць у любых сітуацыях, садзейнічаць таму, каб маладых падчас вяселля ніхто не змог «раз'яднаць», няхай нават на некалькі хвілін.**

І сёння жыццё падае нам нямала «неспадзяванак» у асобе нават самых блізкіх людзей, якія рознымі спосабамі могуць нашкодзіць маладым проста на вяселлі. Менавіта ад гэтага перасцерагалі нашы продкі: «Дружкі пільнуюць, уся дружына глядзіць, і маладая таксама ўвесь час асцерагаецца, каб з вянка, які аздабляе яе галаву, не адшчыкнуў хто-небудзь лістка руты, бо ў такім разе не зможа яна ўжо зберагчы ніводнага з тых дзетак, якіх ёй наканавана мець». Перасцерагчы маладых ад такіх сітуацый — непасрэдны абавязак шафера і шаферкі на вяселлі. «Калі пад вянцом у нявесты выпадае хусцінка, жаніх не павінен падымаць яе, інакш такі неасцярожны муж надоўга пражыве». Падняць любы прадмет, які ўпусцілі нявеста ці жаніх, маглі толькі самыя блізкія да іх у гэты момант людзі, г. зн. шафер і шаферка, для якіх прадметы ці рэчы жаніха і нявесты, наадварот, абяцаюць хуткае замужжа або жаніцьбу.

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

**Дасылайце свае пытанні пра карані і прыстасаванасць да сучаснага жыцця каляндарных і сямейна-побытавых народных традыцый і абрадаў на паштовы або электронны адрас рэдакцыі з пазнакай «Пра радзіннае».**


**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении повторного аукциона**

| |
|---|
| ЛОТ 4: право заключения договора аренды сроком на 5 лет части помещения площадью 82,2 кв. м по адресу: г. Гродно, ул. Буденного, 37. Размер ежемесячной арендной платы: 61,65 базовой арендной величины. Условия проведения аукциона: целевое назначение арендуемых площадей – склад, офис, оказание услуг, розничная торговля. Начальная цена продажи объекта 347,30 руб. (триста сорок семь рублей тридцать копеек) с учетом НДС. Сумма задатка – 35 р. (тридцать пять рублей) |
| Продавец – УП «Барановичское отделение Белорусской железной дороги» объединенная станция Гродно, 230023, г. Гродно, ул. Буденного, 37, тел. 8-0152-73-43-52, факс 8-0152-72-24-58 |
| Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 45-05-38 |
| Условия расчетов и заключения договора аренды: – срок подписания договора аренды – 10 рабочих дней с даты подписания протокола о результатах аукциона с представлением копии платежных документов перечисления суммы за право заключения договора аренды, – срок оплаты – 7 рабочих дней с даты подписания протокола о результатах аукциона (но до заключения договора аренды) |
| Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| **Аукцион состоится 4 ноября 2019 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209** |
| Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона **http://grodnoino.by/aukcion/uchastniku** |
| **Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница)** |
| **Последний день приема заявлений – 31 октября 2019 г. до 15.00** |
| *Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by/* |



**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «МОСТОСТРОЙ» филиал «Мостоотряд № 58»**

Предмет торгов: Лот – Капитальное строение с инвентарным номером 100/С-86216 (наименование – склад II группы; назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ), площадью 2 039,3 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 140100000001029588 площадью 2,0163 га по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Красногвардейская, 108г.

Составные части и принадлежности: забор железобетонный, линия электропередачи, система водопровода.

| Начальная цена, руб. (без учета НДС) | 130 992,00 | Размер задатка, руб. | 3 120,00 |
|---|---|---|---|
| Продавец | Филиал «Мостоотряд № 58» ОАО «Мостострой», УНП 201028628 | | |
| Организатор аукциона | Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» | | |
| Реквизиты для перечисления задатка | Р/с BY76BPSB30121789380179330000 в ОАО «БПС-Сбербанк» Региональная дирекция № 100 по Брестской области, BIC Банка BPSBBY2X, УНП 201028245 | | |
| Условия продажи | Без условий | | |
| Срок заключения договора купли-продажи | В течение 20 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона | | |
| Условия оплаты | В соответствии с заключенным договором купли-продажи | | |
| Информация о возмещении затрат | Участник аукциона, выигравший торги, оплачивает возмещение затрат Организатору аукциона в течение 3 рабочих дней со дня подписания протокола аукциона | | |

**Аукцион состоится 16 октября 2019 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325.**

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, можно узнать у организатора аукциона по телефонам: 8 (0162) 20-92-13, 21-88-81, 8 (029) 626-72-52.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10, 329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00.

**Последний день приема заявлений – 15 октября 2019 г. до 17.00.**

Ранее извещение о продаже имущества ОАО «МОСТОСТРОЙ» филиал «Мостоотряд № 58» опубликовано в газете «Звязда» от 20.08.2019.



**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении повторного аукциона**

| |
|---|
| ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 401/С-27447 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – здание магазина «Мебель и техника в быту»), обшей площадью 680,6 кв. м, расположенное по адресу: г. Скидель, ул. Ленина, 74 |
| Лот № 1 расположен на земельном участке с кадастровым № 422050400002002567, площадью 0,0984 га (назначение – для обслуживания здания магазина «Мебель и техника в быту»), находящемся по адресу: г. Скидель, ул. Ленина, 74 |
| Начальная цена продажи – 160 000 руб. (сто шестьдесят тысяч рублей) с учетом НДС |
| Сумма задатка – 16 000 руб. (шестнадцать тысяч рублей) |
| Продавец – Гродненский филиал Гродненского областного потребительского общества, 230001, г. Гродно, ул. Суворова, 298, тел. 96-06-74 |
| Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70 |
| Условия проведения аукциона – аукцион без условий. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона |
| Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| **Аукцион состоится 16 октября 2019 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209** |
| Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона http://grodnoino.by/aukcion/uchastniku. Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 08.02.2019 г. |
| **Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18** |
| Последний день приема заявлений – 14 октября 2019 г. до 15.00 |
| Телефон для справок: 55-87-71 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by |



**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении повторного аукциона**

| |
|---|
| ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 401/С-33527 (назначение – здание специализированное для общественного питания, наименование – кафе «Визит»), обшей площадью 1410,10 кв. м, расположенное по адресу: г. Скидель, ул. Интернациональная, 3 |
| Лот № 1 расположен на земельном участке с кадастровым № 422050400002002738, площадью 0,2690 га (назначение – земельный участок для обслуживания здания кафе), находящемся по адресу: г. Скидель, ул. Интернациональная, 3. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельные участки, расположенные в водоохранных зонах рек и водоемов, код – 2,4, площадью 0,2690 га |
| Начальная цена продажи – 192 000 р. (сто девяносто две тысячи рублей) с учетом НДС |
| Сумма задатка – 19 200 р. (девятнадцать тысяч двести рублей) |
| Условия проведения аукциона – аукцион без условий |
| Продавец – Гродненский филиал Гродненского областного потребительского общества, 230001, г. Гродно, ул. Суворова, 298, тел. 96-06-74 |
| Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70 |
| Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона |
| Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| **Аукцион состоится 16 октября 2019 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209** |
| Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона http://grodnoino.by/aukcion/uchastniku. Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 17.01.2019 г. |
| Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18 |
| Последний день приема заявлений – 14 октября 2019 г. до 15.00 |
| Телефон для справок: 55-87-71– Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by/ |

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 287-18-36.

# «Да аператыўнага ўмяшання звяртацца прыходзіцца часцей»

**Штогод у мінскім гарадскім цэнтры колапрактологіі, што дзейнічае на базе 2-й клінічнай бальніцы (дарэчы, найстарэйшай медыцынскай установай сталіцы, якая гэтымі днямі святкуе сваё 220-годдзе) выконваецца каля 1,5 тысячы аперацый для пацыентаў з кішэчнымі паталогіямі. У іх ліку — каля 100 рэканструкцыйна-аднаўленчых аперацый, каля 200 — на прамой кішцы. Пры гэтым, нягледзячы на вялікую колькасць хірургічных умяшанняў з мэтай аднавіць кішэчнік, спецыялісты кажуць, што колькасць пацыентаў са стомамі не змяншаецца.**


У аперацыйнай 2-й клінічнай бальніцы Мінска.
Фота БелТА.

## Практалагічныя хваробы: ні ўзрост, ні пол не перашкода

Іх на ўліку каля 1200. Тлумачыцца гэта павелічэннем колькасці анкалагічных пацыентаў, а таксама людзей з хранічнымі запаленчымі захворваннямі кішэчніка, якія патрабуюць этапных аперацый, першая з якіх — устаноўка стомы.

Пацыенты цэнтра колапракталогіі — людзі самых розных узростаў. Ёсць і 18-гадовыя маладыя людзі — як правіла, гэта той, хто меў прыроджаныя паталогіі кішэчніка і спачатку апераваўся ў дзіцячых цэнтрах, а затым перайшоў у дарослы. Але іх няшмат. Куды больш дастаткова маладых пацыентаў, якія маюць запаленчыя хваробы кішэчніка, што развіваюцца ў маладым узросце.

— Гэта вельмі цяжкая група пацыентаў — людзі з язвавым калітам, хваробай Крона. Яны назіраюцца і лечацца пераважна ў гастраэнтэролагаў, але з кожным годам, на жаль, назіраецца такая тэндэнцыя, калі да аператыўнага ўмяшання звяртацца прыходзіцца часцей, — кажа **загадчык колапракталагічнага аддзялення, кандыдат медыцынскіх навук Франц ВЫСОЦКІ.**

Экстранных анкалагічных пацыентаў (з крывацёкамі) таксама аперыруюць у цэнтры. Толькі ў выпадку калі крывацёк удалося спыніць, іх пераводзяць у анкадыспансер для камбінаванага лячэння, калі аперацыі папярэднічае прамянёвая тэрапія. Дарэчы, каланаскапію, як адзін з галоўных метадаў дыягностыкі, які дазваляе пазбегнуць у будучым колярэктальнага раку, Франц Высоцкі раіць рабіць пасля 50 гадоў.

— Калі ў сям'і няма колярэктальнага раку ў анамнезе, то выконваць каланаскапію рэкамендуецца пасля 50 гадоў. Калі ў кагосьці з блізкіх адзначаны эпізод колярэктальнага раку, то пярвічную каланаскапію варта рабіць значна раней — у 40 гадоў. Але часам мы бачым выпадкі анкалогіі ў 30 гадоў. Гэта крайне рэдкія выпадкі. Тут многае залежыць ад клінічнай карціны: калі ёсць крывацёкі, болі, то каланаскапія можа прызначацца і раней.

І мужчыны, і жанчыны аднолькава часта хварэюць на практалагічныя хваробы. У цэнтры вядзецца кансультацыйны прыём, трапіць да ўрача могуць не толькі жыхары Мінска, але і іншых гарадоў. Прайсці лячэнне ў стацыянары іншагароднім таксама можна — на платнай аснове.

Сёння тут развіваюць і лапараскапічныя метады колярэктальнай хірургіі. Наша краіна, дзе такія тэхналогіі пачалі масава ўкараняцца з 2015 года, пакуль адстае ад суседніх краін — Расіі і Польшчы. Першыя такія аперацыі пачалі выконваць у РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава, за чатыры гады іх зроблена каля 130. Маецца аналагічны вопыт і ў Рэспубліканскім клінічным медыцынскім цэнтры Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта. З мінулага года магчымасць зрабіць лапараскапічную аперацыю з'явілася і ў практалагічным аддзяленні 2-й клінічнай бальніцы. Пакуль тут выконваецца ўсяго адна лапараскапічная колярэктальная аперацыя на тыдзень. І для далейшага развіцця гэтага кірунку клініцы патрабуецца дадатковае аснашчэнне лапараскапічнымі стойкамі, сшывальнымі апаратамі і іншым. Зараз для аддзялення плануецца закупіць дадатковую лапараскапічную стойку. Гэта дазволіць павялічыць колькасць такіх аперацый да 2—3 на тыдзень.

— Гэта перспектыўны кірунак. Ён не танны на этапе аперацыі, але такія пацыенты хутчэй выпісваюцца са стацыянара, менш знаходзяцца на бальнічным, у іх менш рызыкі ўзнікнення ўскладненняў, яны не патрабуюць вялікай колькасці абязбольвання, і ў рэшце рэшт лапараскапічны метад сябе апраўдвае, — кажа Франц Высоцкі.

Лапараскапічныя аперацыі лягчэй пераносяцца пацыентам, а вось для хірурга больш затратныя: калі адкрытае хірургічнае ўмяшанне доўжыцца каля чатырох гадзін, то лапараскапічнае — 6—7. У колярэктальнай хірургіі лапараскапічныя аперацыі выконваюцца пацыентам з дывертыкулярнай хваробай тоўстай кішкі і не злаякаснымі і дабраякаснымі (паліпы) пухлінамі, выпадзеннем прамой кішкі.

## Пасля 75 гадоў кожны 10-ы мае парушэнні рытму сэрца

На базе 2-й клінічнай бальніцы дзейнічае і Гарадскі кардыялагічны цэнтр. Колькасць пацыентаў за апошнія 10 гадоў тут павялічылася ў 1,5 раза. Спецыялісты гэта звязваюць і з падаўжэннем працягласці жыцця, і з развіццём тэхналогій, у тым ліку дыягнастычных. Пры гэтым смяротнасць ад сардэчна-сасудзістых захворванняў па-ранейшаму знаходзіцца ў нашай краіне на першым месцы і займае ў структуры 59 %. У Мінску гэта лічба складае 560 чалавек на 100 тысяч насельніцтва, у катэгорыі працаздольных — 95 на 100 тысяч насельніцтва.

— Наш пацыент — узроставы, яго стан нярэдка ўскладнены наяўнасцю неўралагічных, гастраэнтэралагічных, пульманалагічных і іншых паталогій, — кажа **намеснік галоўнага ўрача па кардыялогіі 2-й гарадской клінічнай бальніцы, кіраўнік гарадскога кардыялагічнага цэнтра Раіса ЧЭЧКО.** — Сярэдні ўзрост нашых хворых — 76 гадоў, пры гэтым сярэдні ўзрост жанчын — 82 гады.

На базе 2-й клінічнай бальніцы маецца тры кардыялагічныя аддзяленні: для лячэння вострага каранарнага сіндрому (інфаркту міякарда), хранічнай сардэчнай недастатковасці, складанага парушэння рытму. Працуе два ангіяграфічныя кабінеты, у тым ліку развіваецца эндаваскулярная арытмалогія, павялічваецца колькасць умяшанняў з устаноўкай кардыястымулятараў.

— Гэта важны кірунак, бо пасля 75 гадоў кожны 10-ы пацыент мае парушэнні рытму сэрца, — кажа Раіса Чэчко. — Павялічваем і колькасць аперацый па радыёчастотнай абляцыі.



Псіхалагічны практыкум

# З НЯБАЧНЫМ ГРУЗАМ НА ПЛЯЧАХ

### Як маніпулятары абуджаюць у нас штучнае пачуццё віны і што з ім рабіць?

**Пачуццё віны — наш унутраны компас, які дапамагае вызначыць, што мы збіліся са шляху, дзесьці здрадзілі сабе і сваім прынцыпам. Гэтая эмоцыя дапамагае нам быць больш уважлівымі ў адносінах з іншымі людзьмі. Аднак яна часта і моцна ўскладняе наша жыццё.**

Часта людзі і не здагадваюцца, што пачуццё віны заганяе чалавека ў цяжкае становішча. Мы і самі не заўважаем, як пачынаем азірацца на меркаванне навакольных, падладжвацца пад кагосьці і міжволі набываем панурую позу, быццам нясём нябачны груз на сваіх плячах. Якую шкоду наносіць гэта пачуццё і як ад яго пазбавіцца, мы распыталі **ўрача-псіхатэрапеўта Гарадскога клінічнага псіхіятрычнага дыспансера Марыну ВОЛЧАК.**

***— Марына Міхайлаўна, адкуль увогуле бярэцца пачуццё віны?***

— Яно не нараджаецца само па сабе. У дзяцінстве яго з'яўленне правакуюць бацькі, якія выкарыстоўваюць віну ў выхаваўчых мэтах — «як табе не сорамна?» У дарослым жыцці — людзі-маніпулятары («ты абавязаны!»). Дарэчы, асэнсаванне таго, адкуль у вас узялося пачуццё віны, можа наблізіць да пазбаўлення ад яго.

***— Што такое віна? Гэтае пачуццё заўсёды нясе толькі шкоду?***

— Віна — гэта перажыванне пасля няправільнага ўчынку ці выбару: я зрабіў дрэнна, не так, як трэба было. Віна бывае двух відаў: натуральная і штучная. Натуральная — гэта «голас сумлення». Яна неабходная нам для вызначэння кардынат руху і развіцця. Патлумачу на прыкладзе: маці сарвалася, накрычала на дзіця і адчувае за гэта віну. Гэта стымулюе жанчыну да таго, каб папрасіць прабачэння ў малога і растлумачыць яму прычыны зрыву. А таксама знайсці больш бяспечны выхад негатыўных эмоцый і прывучыць сябе ім карыстацца. Яшчэ адна асаблівасць здаровай віны — адсутнасць самабічавання. Ніхто не ідэальны, а таму не павінен несці пакаранне за памылкі ў мінулым.

Але найчасцей мы маем справу са штучна створаным пачуццём віны. Яго крыніца — маніпуляцыі навакольных. Яно ўзнікае, калі мы фарміруем завышаныя чаканні да сябе або трапляем пад уплыў маніпулятараў з завышанымі чаканнямі. Так і з'яўляецца чалавек з апушчанай галавой і прыўзнятымі плячыма. Прыклад штучнай віны — гісторыя дарослай дачкі, якая ўсё жыццё чула папрокі маці: «Я дыплом на цябе прамяняла, а ты будзеш грубіяніць мне?» У такой сітуацыі дачка ўспрымае само сваё існаванне як віну перад маці. І натуральнай рэакцыяй становіцца спроба кампенсаваць маці ўсе яе «пакуты» пастаяннай увагай, асабліва калі тая будзе і далей умацоўваць віну папрокамі.

***— Якую шкоду нясе нам штучнае пачуццё віны?***

— У адрозненне ад пачуцця адказнасці, пачуццё віны нерэалістычнае, неканкрэтнае, размытае. Яно жорсткае і несправядлівае, пазбаўляе нас упэўненасці ў сабе і зніжае самаацэнку. А таксама нясе адчуванне цяжару, выклікае дыскамфорт, напружанасць, страхі, расчараванне, песімізм, самоту. Папросту віна аднімае нашу энергію і змяншае актыўнасць. Гэта адбіваецца і на цялесным узроўні: у чалавека літаральна мяняецца цела, у першую чаргу постаць. У такіх людзей панурая поза, згорбленыя плечы, як быццам яны нясуць груз на сваім «гарбе». Дарэчы, захворванні пазваночніка ў зоне сёмага шыйнага пазванка ў многіх выпадках, апроч яўных траўмаў, звязаныя з хранічным пачуццём віны. Такога чалавека можна вызначыць па хадзе: яна скаваная, у іх ніколі не бывае шырокага кроку, свабоднай жэстыкуляцыі, гучнага голасу. Яны часта нізка апускаюць галаву і погляд, а на твары — маска вінаватасці.

***— Як змагацца з гэтым пачуццём?***

— На думку вядомага французскага псіхіятра Жака Лакана, мы адчуваем пачуццё віны выключна з-за немагчымасці звярнуць увагу на ўласныя жаданні. Канешне, гаворка ідзе не пра ўвасабленне злачынных намераў ці нязначных капрызаў. Тут маецца на ўвазе жыццёвая сіла, здольная напоўніць сэнсам наша існаванне. Мы ведаем мноства прыкладаў, калі мастакі ці музыканты стваралі ўнікальныя шэдэўры, нягледзячы на голад ці жудасныя ўмовы. Толькі калі мы будзем ісці за нашымі жаданнямі, мы можам прыйсці да самастойнасці. Тут не трэба азірацца на меркаванне навакольных ці падстройвацца пад кагосьці. Мы самі выбіраем жыццёвы шлях, па якім будзем ісці. Але перш чым сказаць, што рабіць з пачуццём віны, адзначу, чаго рабіць дакладна не варта. Ніколі не варта давяраць вырашэнне праблемы алкаголю. Гэта толькі ўзмоцніць пачуццё віны. Не трэба апраўдвацца, бо звычайна гэта не працуе. Але і забываць пра віну, імкнучыся схаваць яе далей, не звяртаць на гэтую эмоцыю ўвагі таксама нельга.

***— А што тады трэба рабіць?***

— Самы просты і адэкватны спосаб вырашэння праблемы — заўсёды дзейнічаць у межах свайго сумлення, не супярэчыць сваім каштоўнасцям і рабіць усё ў адпаведнасці з тым, як вам будзе лепш. Трэба памятаць, што знешнія фактары — іншыя людзі, рэлігіі, забароны — пастаянна аказваюць на нас уплыў. Старайцеся абараніць сваю сістэму каштоўнасцяў, калі яна не супярэчыць маральным і этычным нормам. І любое дзеянне здзяйсняйце, адштурхоўваючыся ад яе. У гэтым вам дапамогуць пытанні: «Ці сапраўды я гэтага хачу?», «Што мне гэта дасць?», «Ці змагу я спакойна жыць з наступствамі майго ўчынку?» і падобныя.

Пастарайцеся зразумець, ці існуе ваша віна на самай справе ці гэта вынік вашага ўяўлення. Калі вы прыйдзеце да высновы, што пачуццё віны ілюзорнае, вам лягчэй будзе ад яго пазбавіцца. Калі віна ўсё ж ёсць, вам варта папрасіць прабачэння ў таго, перад кім вінаватыя. Калі гэта ўжо немагчыма, проста прагаварыце сваё выбачэнне ўслых, уяўляючы гэтага чалавека. Пагаварыце пра сваё пачуццё віны з кімсьці з блізкіх. Часта бывае дастаткова выгаварыцца, каб зняць камень з душы. Таксама ўспомніце і прааналізуйце прычыны, па якіх вы здзейснілі ўчынак, які выклікае пачуццё віны. Знайдзіце для сябе апраўданні. Напрыклад, такое: вы не маглі загадзя разумець вынікі свайго ўчынку.

# ТЭАТР, ВЫСТАЎКА РАРЫТЭТАЎ І МАЙСТАР-КЛАС ПА ПЕРАПЛЁТАХ

## Усё гэта — часткі культурнай праграмы, якая бліжэй знаёміць беларусаў з Берасцейскай Бібліяй



Алесь СУША чытае публічную лекцыю пра Берасцейскую Біблію.

**Факсімільнае ўзнаўленне Берасцейскай Біблії, як і яе выданне больш за 450 гадоў таму, стала для Беларусі вялікай культурнай падзеяй. Брэст да свайго тысячагоддзя атрымаў ад Прэзідэнта ва ўсіх сэнсах каштоўны і значны падарунак — арыгінал выдання. У даследчыкаў з'явілася магчымасць глыбокага вывучэння аднаго з самых старажытных беларускіх кніжных помнікаў, а ўсе ахвотныя гэтай восенню могуць дакрануцца да аднаго з сімвалаў нашай гісторыі і нацыянальнай культуры. Прычым зрабіць гэта можна і ў Брэсце ў музеі гісторыі горада, і ў Мінску — Нацыянальная бібліятэка цягам паўтара месяца праводзіць цыкл рознафарматных мерапрыемстваў «Берасцейская Біблія: адкрыты дотык».**

— Я магу назваць сама меней 30 прычын для ўшанавання гэтага, самага дарагога і прыгожага ў гісторыі айчыннага кнігадруку, кніжнага помніка і падказак, чаму варта ім ганарыцца, — сказаў падчас адкрытай публічнай лекцыі, што дала старт серыі мерапрыемстваў, **намеснік дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі па навуковай рабоце і выдавецкай дзейнасці, каардынатар і навуковы кіраўнік праекта Алесь СУША.**

У спісе гэтых прычын ёсць, напрыклад, такія:

**Берасцейская Біблія — доказ уключанасці беларускай культуры ў сусветны працэс.** Аб гэтым, упэўнены даследчык, сведчаць стасункі на роўных князя Мікалая Радзівіла Чорнага з волатамі эпохі Адраджэння, вядомымі рэлігійнымі дзеячамі, кіраўнікамі многіх дзяржаў свету, сярод якіх кароль польскі Жыгімонт Аўгуст, імператар Свяшчэннай Рымскай імперыі Максіміліян II, герцаг Прусіі Альбрэхт і многія іншыя — звароты да якіх сустракаюцца ў тэксце Берасцейскай Біблії.

**Гэта самае вядомае выданне першай друкарні на беларускай зямлі.** «Ці многія ведаюць, што менавіта ў Берасцейскай друкарні былі выпушчаны першыя айчынныя ноты або палітычныя граматы, зборнікі заканадаўчых актаў? — разважае Алесь Суша. — Большасць з іх да сёння, на жаль, проста не захавалася, таму пра іх цяжка меркаваць, а вось Берасцейская Біблія дайшла да нас праз стагоддзі».

**Берасцейская Біблія — сімвал ахвярнасці і мецэнацтва.** Па ацэнках даследчыкаў, канцлер ВКЛ князь Мікалай Радзівіл Чорны, на грошы якога ў верасні 1563 года выданне ўбачыла свет, выдаткаваў ад 5 да 10 тысяч дукатаў — на той час гэта была выключна вялікая сума.

**Адзін з вельмі ўдалых PR-праектаў у еўрапейскай культуры XVI стагоддзя.** Прафінансаваўшы выданне Берасцейскай Біблії, Мікалай Радзівіл насамрэч зрабіў вельмі ўдалыя інвестыцыі на будучыню — у прэстыж не толькі свайго роду, які прымусіў свет лічыцца з Радзівіламі, але і наогул сваёй краіны.

**Кніга як сведка велічы і магутнасці Берасця, сімвал старажытнага і сучаснага горада.** Брэст першы з беларускіх гарадоў атрымаў магдэбурскае права і гарадскую ратушу, тут з'явіліся першая аптэка і шпіталь, першая сінагога... «Берасце было цэнтрам эканомікі і культуры свайго часу, і той факт, што менавіта тут убачыла свет першае ў Беларусі і Усходняй Еўропе поўнае выданне Біблії, таксама пацвярджае статус і веліч горада», — упэўнены Алесь Суша. У наш час Берасцейская Біблія вярнулася ў горад у выглядзе асобнага помніка і часткі скульптурнай кампазіцыі да 1000-годдзя Брэста, у факсімільным і арыгінальным варыянце, як аснова новага турыстычнага маршруту — словам, стала неад'емнай часткай ужо сучаснай культуры.



Да 7 кастрычніка факсіміле знаходзіцца ў адкрытым доступе ў Нацыянальнай бібліятэцы.

Зрэшты, больш поўны пералік 30 прычын з падрабязным іх тлумачэннем і абгрунтаваннем змешчаны ў дадатку — навуковым даследаванні Алеся Сушы «Асэнсаванне шэдэўра», якім суправаджаецца кожнае факсіміле Берасцейскай Біблії. Яго, дарэчы, пачалі ўжо замаўляць некаторыя ўстановы, ёсць зацікаўленасць і з боку калекцыянераў-кніжнікаў — таму 11 факсіміле, выдадзеных сёлета ў жніўні ў дзяржаўна-прыватным партнёрстве з ЗАСТ «Белнафтастрах», гэта толькі пачатковая лічба. Велічны помнік нацыянальнай кніжнай культуры вяртаецца ў Беларусь — як у матэрыяльным выглядзе ў бібліятэкі і музеі, так і ў грамадскую свядомасць, гэта ўсцешвае.

Да 7 кастрычніка факсіміле Берасцейскай Біблії будзе знаходзіцца ў адкрытым доступе ў атрыуме Нацыянальнай бібліятэкі. «Можна прыйсці пагартаць, пачытаць, папрацаваць з тэкстам, а калі захочаце, пападымаць 15-кілаграмовы фаліянт», — напаўжартам запрашаюць бібліятэкары. Потым выданне пераедзе ў Музей кнігі. А цыкл мерапрыемстваў працягне выстаўка арыгінальных выданняў Берасцейскай Біблії (нагадаем, сёння ў свеце вядомыя 130 асобнікаў, у тым ліку ў Беларусі пяць, але ўсе яны няпоўныя) — плануюць прадставіць шаноўнай публіцы нават тыя рарытэты з прыватных калекцый, якія раней нідзе і ніколі не выстаўляліся. Для даследчыкаў — мовазнаўцаў, мастацтвазнаўцаў, культуролагаў, гісторыкаў — неўзабаве будзе зладжаны навуковы круглы стол, прысвечаны Берасцейскай Біблії, пасля якога, магчыма, загадак і міфаў вакол выдання стане менш — а мо, наадварот? У Клубе кніжных прафесараў адбудуцца тэматычныя музейныя заняткі для дзяцей. Таксама ў праграме мерапрыемстваў, якая будзе доўжыцца з пачатку кастрычніка да пачатку — сярэдзіны лістапада, — лекцыі экспертаў, майстар-клас па пераплётах, адмысловая акцыя ў галіне кніжнай графікі з удзелам мастакоў-ілюстратараў, тэатралізаваныя імпрэзы, у тым ліку фрагменты з пастаноўкі «Біблія князя Радзівіла»... «Далучайцеся — гарантую, будзе цікава і карысна», — сур'ёзна гаворыць Алесь Суша.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**
**Фота — Нацыянальная бібліятэка Беларусі.**

# Яўхім Карскі: помнік з 1,3 тысячы старонак



З якіх прычын навучэнец Мінскай духоўнай семінарыі Яўхім Навіцкі стаў Карскім? Якую ацэнку атрымала першая ў гісторыі навуковая дысертацыя, прысвечаная беларускай мове, — «К гісторыі гукаў і формаў беларускай гаворкі»? За што беларуская вучонага крытыкавалі ў прэсе і знялі з пасады прафесара Мінскага педагагічнага інстытута? Адказы на гэтыя і многа іншых пытанняў дапытліваму чытачу дае двухтомнік «Акадэмік Я. Ф. Карскі. Біяграфія», што ўбачыў свет сёлета. Прэзентацыя выдання адбылася спачатку на кніжным кірмашы ў Маскве, а напрыканцы верасня прайшла і ў Мінску. І хоць сам аўтар, праўнук акадэміка, славіст і архівіст Аляксандр Карскі не змог прысутнічаць на прадстаўленні кнігі беларускай аўдыторыі, значнасць яго работы ўжо ацанілі многія тэарэтыкі і практыкі мовазнаўства: літаратары, навукоўцы, журналісты, выкладчыкі і студэнты-лінгвісты.

«Акадэмік Я. Ф. Карскі. Біяграфія» — праца насамрэч важкая. Аўтар аддаў ёй без малога 20 гадоў жыцця карпатлівага вывучэння архіваў, а выдаўцы, «Беларускі паліграфкамбінат імя Якуба Коласа» сумесна з выдавецтвам «Бялова груп», падлічылі, што на тыраж кнігі аб'ёмам у 1340 старонак спатрэбілася каля 4 тон паперы. Але галоўная адметнасць кнігі, зразумела, не ў гэтых лічбах.

Рэч у тым, падкрэсліве старшыня Беларускага камітэта славістаў, першы намеснік дырэктара па навуковай рабоце Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі Аляксандр Лукашанец, што на сёння гэта выданне — самая поўная біяграфія заснавальніка беларускай філалогіі. У двух тамах сабраныя падрабязныя і дакладныя, падмацаваныя шматлікімі дакументамі з архіваў і бібліятэк звесткі пра жыццёвы шлях і навуковыя пошукі Яўхіма Фёдаравіча Карскага. Ураджэнец вёскі Лаша Гродзенскай губерні паспеў зрабіць вельмі многа: скончыць прэстыжны ў Расійскай імперыі Нежынскі гісторыка-філалагічны інстытут (цяпер на сценах гэтай навучальнай установы на Чарнігаўшчыне змешчана мемарыяльная дошка ў гонар нашага земляка) і ўзначаліць Варшаўскі ўніверсітэт, атрымаць залаты медаль Расійскага геаграфічнага таварыства і Ламаносаўскую прэмію, стаць у 40-гадовым узросце членам-карэспандэнтам Расійскай, пазней — Чэшскай акадэміі навук, зладзіць шэраг навуковых экспедыцый падчас знаходжання на пасадзе дырэктара Музея антрапалогіі і этнаграфіі, аб'ехаць ці не ўсю Беларусь, па драбінках збіраючы фальклор і фіксуючы мясцовыя дыялекты, напісаць больш за 700 даследчых работ па этнаграфіі, славістыцы і ў прыватнасці беларусістыцы.

Галоўная жамчужына яго навуковай спадчыны — знакамітае трохтомнае фундаментальнае даследаванне «Беларусы» — вынік комплекснага параўнальна-гістарычнага вывучэння гісторыі, мовы і пісьменства, фальклору, наогул культуры беларускага народа, што дазволіла навукова абгрунтаваць нацыянальную самабытнасць беларусаў. Вучоным з усяго свету Карскі вядомы як першаадкрывальнік многіх кірункаў — беларускай лексікаграфіі, словаўтварэння і граматыкі, дыялекталогіі, этна-, сацыялінгвістыкі, лінгвагеаграфіі і нават гендарнай лінгвістыкі. Напрыклад, ён першым звярнуў увагу і настойліва падкрэсліваў, што, каб атрымаць поўную моўную карціну, даследчыку неабходна асобна вывучаць мову гарадоў і вёсак, мястэчак бліз чыгункі, мову мужчын і жанчын — бо гэта розныя мовы.

...Праз шмат гадоў землякі не толькі шануюць памяць і захоўваюць спадчыну (так, каля 2,5 тысячы кніг з бібліятэкі Карскага знаходзяцца ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі), але і працягваюць распачатыя вучоным мовазнаўчыя даследаванні, у тым ліку падчас Міжнародных Карскіх чытанняў. Першая з гэтых навуковых канферэнцый, прыгадвае іх арганізатар, прафесар Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта Марыя Канюшкевіч, была зладжана яшчэ ў 1990 годзе і прайшла для шырокай грамадскасці амаль незаўважна, затое трэція Карскія чытанні сабралі ўжо 55 лінгвістаў з Беларусі. Расіі, Украіны і Польшчы, а ў сёмай па ліку канферэнцыі ўзяло ўдзел звыш ста даследчыкаў з розных краін, і традыцыя не перапыняецца. У маі 2020 года збярэцца ўдзельнікаў ужо 15-я, юбілейныя навуковыя чытанні, прымеркаваныя да 160-годдзя з дня нараджэння Яўхіма Карскага. Прычым шляхі навукоўцаў да канферэнцыі часам нязведаныя: так, аднойчы японскі (!) вучоны-русіст даведаўся пра асобу акадэміка Карскага ад свайго выкладчыка падчас стажыроўкі ў Чэхіі (!) — і быў так уражаны, што прыехаў у Беларусь, каб паглядзець на зямлю, што нарадзіла такога вялікага чалавека...



Фота belkniga.by.

«А ці помніце вы, што Карскі быў рэктарам Варшаўскага ўніверсітэта якраз у час хвалявання польскіх студэнтаў? — пытаецца Марыя Канюшкевіч. — Вельмі цікава было даведацца з кнігі, як ён сябе паводзіў; гэта суцэльны навуковы дэтэктыў, прычым не прыдуманы, а заснаваны на сапраўдных звестках». А студэнтам і выкладчыкам філалагічных кафедраў розных універсітэтаў, перакананая прафесар, «Карскага трэба чытаць, каб вучыцца навуковай чэснасці, не верхагляздству, а павазе да фактаў».

Хоць кніга «Акадэмік Я. Ф. Карскі. Біяграфія» — навукова-папулярная, але напісаная яна добрай і зразумелай літаратурнай мовай, а таму, перакананыя мовазнаўцы, будзе карыснай і цікавай не толькі для падрыхтаванай аўдыторыі, але і для шырокага кола чытачоў — па вялікім рахунку для ўсіх, хто любіць і ганарыцца беларускай мовай. Невыпадкова ва ўступным слове да выдання міністр інфармацыі Беларусі Аляксандр Карлюкевіч называе кнігу «даследаваннем — помнікам вялікаму прашчуру, якое мала прачытаць адзін раз».

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**

Традыцыі малой радзімы

# КРЫЧАЎСКІ КОНІК:

## свістулька, абярэг і брэнд горада

**Старажытнаславянскі вершнік, які сядзіць на істоце, што нагадвае напалову качку, напалову каня, стаў галоўным героем IV Міжрэгіянальнага фестывалю-конкурсу народнай творчасці, які ўжо чацвёрты раз прайшоў на крычаўскай зямлі. Мастацтва адраджэння панямонскай глінянай цацкі агорнута таямнічымі павер'ямі і мае шмат прыхільнікаў. Паказаць сваё ўменне ў творчых спаборніцтвах і адзначыць 883-годдзе Крычава з'ехалася больш за 30 майстроў з Магілёва, Клімавіч, Чавус, расійскага Рослаўля і, вядома, мясцовых рамеснікаў.**



### Качка — сімвал ночы, конь — сонца




Знайсці прыгажосць у мінулым, зразумець яго таямнічасць, адрадзіць у сучаснасці традыцыі — справа цяжкая, але захапляльная, упэўнены майстры. Яны ўдзельнічаюць у падобных святах не дзеля перамог ці тытулаў, а перш за ўсё таму, што не ўяўляюць сябе і свайго жыцця без творчасці, без натхнення на вобразы, якімі яны перадаюць любоў да радзімы і сусвету, дораць дабрыню праз цяпло жывога матэрыялу — гліны.

Ідэйны натхняльнік фестывалю, дзякуючы якому Крычаў атрымаў самабытны брэнд, **народны майстар Беларусі Вячаслаў ЯКАВЕНКА,** займаецца адраджэннем падняпроўскай цацкі не адзін дзясятак гадоў. На свяце ён завіхаецца ў некалькіх ролях: і распарадчык, і суддзя конкурсу, і ўдзельнік выстаўкі. Аднак бачыць, што справа твая працягваецца ў юных майстрах, а фестываль з кожным годам набірае абароты, — кажа ён.

— На нашым фестывалі па лепцы з гліны можна было ляпіць што заўгодна: свістульку, фігурку, любы дэкаратыўны выраб, — акрэслівае майстар. — Большасць канкурсантаў ляпіла ўсё ж, канешне, канька. Прычым кожны ўяўляў яго сабе па-рознаму. Адметнасць менавіта крычаўскай качкі-каня ў тым, што яна мае галаву каня і тулава качкі. Качка — сімвал ночы і мацярынства — ахоўвала чалавека ў цемры, а конь — сімвал сонца, любові і ўрадлівасці — у светлы час.

— Ацэньвалі ў першую чаргу якасць і цікавае афармленне фігуркі. А калі гэта свістулька, яна павінна абавязкова «заспяваць». На прысутнасць у вырабе народных традыцый мясцовасці, адкуль паходзіць удзельнік конкурсу, таксама звяртаем увагу, — тлумачыць **Любоў ЯШЧАНКА, член беларускага саюза майстроў народнай творчасці,** якая ўжо дваццаць гадоў займаецца гліняным рамяством разам з Вячаславам Мікалаевічам і столькі ж ідзе з ім поруч як другая палова. — Часцей за ўсё выкарыстоўваецца ў творчасці і ў цацках тое, што больш цэніцца. А ў гаспадарцы гэта быў перш за ўсё конь. Ён і зямлю арэ, і грузы перавозіць, без яго як без рук. Перад канём і даўней людзі схіляліся, і цяперашняя дзятва як зачараваная на яго пазірае. Гэта асаблівая жывёла.

### Прафесія і хобі

Удзельнікаў конкурсу падзялілі на дзве катэгорыі: дарослых і дзяцей. Трэба адзначыць, што нешта тлумачылі і падказвалі ўдзельнікам арганізатары бадай што аднолькава.

12-гадовы Кірыл, напрыклад, лепіць каня. Хлопчык кажа, што ён самавучка. «Мая цётка мастачка, і я вучуся ў яе». А вушкі і грыву да каня Кірылу дапамагае рабіць 10-гадовая Вераніка. Яна гаворыць, што лепкай сур'ёзна не займаецца, аднак любіць крыху паляпіць з пластыліну розныя фігуркі. «У мяне атрымліваецца, люблю паляпіць, калі ідэі з'яўляюцца», — кажа яна, робячы грыву на будучай свістульцы ў вобразе каня. Таня побач лепіць плоскую фігурку пеўня.

А вось Ілья Кавалькоў, выхаванец дзіцячай народнай студыі «Свістулька», які стварае на конкурсе выраб у вобразе «вершніка на качцы». Побач Стас лепіць звычайнага каня. Абодва 13-гадовыя хлопцы родам з Крычава і займаюцца ў студыі Вячаслава Якавенкі тры гады.

— Ужо столькі зрабіў свістулек, што і падлічыць не магу. Нешта пакідаю сабе, штосьці прадаецца, сябрам падарункі раблю, — кажа Ілья.

Ён ужо вызначыўся, што стане прафесійным майстрам і прысвеціць жыццё панямонскай цаццы. Тым больш што ўжо цяпер, падлеткам, ён удзельнічае ў разнастайных імпрэзах рамеснікаў самастойна, а на сёлетнім «каньку» атрымаў гран-пры.

Стас жа кажа, што для яго лепка — цікавае і прыемнае хобі, ды і пальцы становяцца праз гэта мацнейшыя ды больш лоўкія.





### Сава, падкова, кот, хатнік...

Гран-пры конкурсу сярод дарослых удзельнікаў узялі выкладчыцы чавускай дзіцячай школы выяўленчых мастацтваў і мастацкіх рамёстваў Надзея Ярмак і Дар'я Шамбурава. Надзея рабіла каня, а Дар'я — чалавечка-хатніка, абодва вырабы яшчэ і свістулькі. У пацвярджэнне Дар'я паказвае, які гук атрымаўся ў яе фігуркі.

— Мы ў школе выкладаем па прадметах усё — лепку, малюнак, жывапіс, кампазіцыю. Хоць найбольш дзеці ў нас любяць менавіта лепку, — кажа Надзея. — Усяго займаецца 117 дзетак.

— На вёску таксама прыязджаем. У Каменцы, напрыклад, да нас займацца ледзьве не ўся школа прыходзіць, — дадае Дар'я.

Першае месца ў дарослай катэгорыі заняў клімавіцкі дом рамёстваў у асобах Таццяны Сапажковай і Людмілы Крыўцовай. А другое падзялілі паміж сабой Вікторыя Сотнікава з агульна-адукацыйнага цэнтра «Паўднёвы» ў Рослаўлі і Сяргей Масіха, які займаецца ў народнай студыі «Добрасць» у Крычаве.

Вікторыя расказала, што на фестывалі ляпіла саву як сімвал мудрасці.

— Я актыўна займалася фатаграфіяй, пасля перайшла на гліну, таму што працую з дзецьмі ў інтэрнаце і мы займаемся лепкай. Мне вельмі цікава даведацца ад беларускіх майстроў, як рабіць свістулькі.

Яе сын, дзевяцігадовы Саша, ужо другі раз удзельнічае ў крычаўскім конкурсе і кажа, што і маляваць, і ляпіць яму падабаецца. «Я люблю коней, але яны не вельмі ў мяне атрымліваюцца, таму ляпіў ката і птушку». За іх хлопчык і атрымаў другое месца ў дзіцячай катэгорыі.

— А якія ён танкі з пластыліну робіць! Нават цэлыя баталіі разыгрывае з падзелак уласных, — ганарліва дадае яго дзядуля, Міхаіл Сотнікаў, кіраўнік выяўленчай студыі «Палітра», дзе выкладае больш за 25 гадоў. — А я ляпіў падкову з канём унутры як сімвал шчасця. Хоць лепка для мяне як дапаўненне да маёй творчасці, якому вучылі ў інстытуце. Я найперш жывапісец.

Так што на свяце ў расіян атрымаўся сапраўдны сямейны творчы падрад.

### Птушка шчасця

Творы рамеснікаў таксама здзіўлялі багаццем вырабаў з гукамі, сэнсам ці практычным прымяненнем. Гліняныя коцікі, конікі, рыбы, чарапахі, птушкі, авечкі, разнастайныя збаночкі, падсвечнікі, званочкі, кубачкі, пано на сцяну... Усё гэта можна было памацаць, разгледзець, набыць. Кожная свістулька, дарэчы, цудоўна імітуе голас той істоты, у выглядзе якой зроблена.

А некаторыя рэчы тут маюць сакральны сэнс. Любоў Яшчанка, прынамсі, робіць не толькі канькоў, але і гліняных соў, якія дапамагаюць людзям у іх жаданнях, вядома, калі ў гэта шчыра верыць. Не адзін пакупнік ужо вяртаўся да майстрыхі з падзякай і расказам, як змяніла іх жыццё птушка.

На фестывалі ж ніводнай савы навідавоку не было, і я вырашыла, што для маёй яшчэ таксама не час... Пакуль Любоў Міхайлаўна не дастала з каробкі саву-свістульку. Што яна мая, я адчула разам з нечаканым цяплом, калі майстрыха загаварыла саву на шчасце проста ў маёй руцэ. Вера — гэта вялікая моц, варта памятаць пра гэта, вагаючыся, ці займацца любімай справай. Майстры ведаюць...

**Ірына СІДАРОК,**
**фота аўтара.**

# УСЕ НА СТАРТ!

**У мінулыя выхадныя горад Старыя Дарогі ператварыўся ў вялікую лёгкаатлетычную пляцоўку. Тут прайшоў чарговы Нацыянальны фестываль бегу «Языльская дзясятка», які сабраў больш за дзве тысячы спартсменаў з усіх куткоў Беларусі.**

— Фестываль сёлета адзначыў 32-і дзень нараджэння — гэта салідны ўзрост. І ў той жа час ён малады. А ўсё таму, што ў ім прымае ўдзел шмат моладзі. Мы заўсёды рады вітаць на бегавых дарожках маладых людзей, якія робяць першыя крокі ў лёгкай атлетыцы, і людзей паважанага ўзросту, якім за 70 гадоў, але яны не развітваюцца са спортам, — сказаў **ініцыятар і галоўны суддзя «Языльскай дзясяткі» Мікалай ГРУЗД.**

Сёлета для лёгкаатлетаў пашырылі фармат спаборніцтваў: да традыцыйных забегаў і дыстанцый дадалі яшчэ два цікавыя этапы для школьнікаў. Першы — гэта «Дынамічная эстафета», у якой удзельнічалі лёгкаатлеты ўстаноў агульнай і сярэдняй адукацыі і спецыялізаваных вучэбна-спартыўных школ ад 10 да 17 гадоў. Яна прайшла па трасе, дыстанцыя якой склала 3600 метраў. Кожны з васьмі этапаў пераадольвалі хлопчык і дзяўчынка ў чатырох узроставых катэгорыях. Пачалі яе юныя бегуны 14-15 гадоў, кожны з іх прабег па 200 метраў. Затым яны перадалі эстафету 12-13 гадовым спартсменам, у якіх дыстанцыя была 400 метраў. Затым працягнулі падлеткі 14-15 гадоў, іх адрэзак склаў 500 метраў. Завяршылі эстафету юнакі і дзяўчаты 16-17 гадоў, якім заставалася прабегчы па 600 метраў.

Другі этап — гэта «Спорт забег», які стартаваў адначасова з «Языльскай дзясяткай». Тут арганізатары фестывалю далі магчымасць праявіць сябе спартсменам ад 12 да 17 гадоў, якія прафесійна займаюцца бегам (навучэнцы аддзяленняў лёгкай атлетыкі спецыялізаваных вучэбна-спартыўных устаноў), але з прычыны свайго ўзросту не могуць удзельнічаць у дзесяцікіламетровым забегу. Іх дыстанцыя — 2500 метраў. Яны беглі побач са славутымі беларускімі лёгкаатлетамі, што стала добрым стымулам да перамогі.

І яшчэ адна асаблівасць фестывалю. Сёлета аб'ядналі школьны і дарослы «Карпаратыўны забег». Гэта спаборніцтвы сярод каманд устаноў адукацыі, прадпрыемстваў, арганізацый, якія не спецыялізуюцца па лёгкай атлетыцы.

Упершыню «Языльская дзясятка» была праведзена 6 лістапада 1988 года ў вёсцы Языль Старадарожскага раёна Мінскай вобласці. Там сабраліся 87 бегуноў. Звычайны лёгкаатлетычны прабег, прысвечаны Дню работнікаў сельскай гаспадаркі, пастунова перарос у адно з самых масавых мерапрыемстваў краіны.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

## Извещение о проведении открытого аукциона по продаже имущества ЗАО «Ростэм»

| Лот | Наименование | Местонахождение | Начальная цена без НДС, бел. руб. | Задаток, бел. руб | Шаг аукциона без НДС, бел. руб |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Доля в уставном фонде Общества с ограниченной ответственностью «Агрофирма Илья» в размере 100 % | Минская область, Вилейский р-н, д. Ободовцы | 6 916 000,00 | 691 600,00 | 345 800,00 |
| 2 | Доля в уставном фонде Общества с ограниченной ответственностью «Парк развлечений Дримлэнд» в размере 100 % | г. Минск, ул. Орловская, 80 | 9 752 787,00 | 975 278,70 | 487 639,35 |
| 3 | Предприятие как имущественный комплекс «Центральный рынок строительных материалов в Уручье» (рег. номер 0001440, свидетельство № 3460 от 20.05.2019) | г. Минск, ул. Уручская, 19 | 9 439 000,00 | 943 900,00 | 471 950,00 |

***В отношении вышеуказанного имущества проводятся первые торги. Окончание приема заявлений в 18.00 05.11.2019.***

УСЛОВИЯ

Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано единственным участником, либо единственный участник явился для участия в аукционе и он согласен приобрести Объект (Объекты) по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов), – Претендент на покупку должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта (Объектов) после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, затрат на публикацию в течение 14 (четырнадцати) дней со дня проведения аукциона.

Оплата приобретенного на аукционе Объекта (Объектов) производится в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее 30 (тридцати) дней со дня проведения аукциона.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона и затрат по размещению публикации в газете и на сайте bankrot.gov.by на основании счета-фактуры в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона.

На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона.

**Аукцион состоится 06.11.2019 в 12.00 (регистрация участников с 11.30 до 12.00) по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1121.**

Порядок оформления участия в аукционе, критерии выявления победителя торгов и порядок оформления результатов торгов содержатся на сайте https://sites.google.com/site/pcjuristcom/torgi.

До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с BY36ALFA30122215570040270000 в Отделении «На Красной» ЗАО «Альфа-Банк», код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера». Назначение платежа: «задаток для участия в аукционе по продаже имущества ЗАО «Ростэм» (Лот №__), проводимом __.__.2019 г.»

Участник торгов, желающий участвовать в торгах по нескольким лотам, вносит задаток в размере, установленном для лота с наибольшей начальной ценой.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1121.

Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектами аукциона. Контактное лицо для осмотра Лота № 1: +375 (44) 759-42-67 Михаловский Эдуард Михайлович;

Лота № 2 +375 (29) 115-51-47 Мордашко Алексей; Лота № 3 +375 (29) 611-18-59 Лембович Татьяна Казимировна.

Дополнительная информация по предмету торгов, по телефону +375 29 308 28 97 (Анаида).

Организатор аукциона вправе после опубликования извещения о проведении аукциона отказаться от его проведения в любое время, но не позднее чем за пять дней до наступления даты его проведения.

Организация и проведение аукциона осуществляются на основании норм Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)».

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ООО «Фрондера»: ☎ 8 (029) 305 86 50 ● e-mail: frondera@mail.ru** |
| **Продавец** | **ЗАО «Ростэм» в лице антикризисного управляющего ООО «Центр финансового оздоровления «Партнер-Консультант» ● 8 (029) 365-06-97** |

## ООО «Фрондера» извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества Государственного предприятия «СЛУЦКОЕ УПРАВЛЕНИЕ ПРОИЗВОДСТВЕННО-ТЕХНОЛОГИЧЕСКОЙ КОМПЛЕКТАЦИИ»

| Лот | Наименование | Местонахождение | Начальная цена без НДС, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | **ЛОТ № 1,** в составе: 1. Капитальное строение с инв. № 640/С-26504, площадь – 1 868,3 кв. м, назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – ремонтно-механическая мастерская; 2. Ограждение территории (8/100 доли); 3. Техническая площадка (9/100 доли) | Минская обл., г. Слуцк, ул. Тутаринова, д. 19А/19 | 111 439,74 | 11143,97 | 5571,99 |
| 2 | **ЛОТ № 2**, в составе: 1. Капитальное строение с инв. № 640/С-26493, площадь – 1 781,1 кв. м, назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – административно-бытовой корпус; 2. Ограждение территории (8/100 доли) | Минская обл., г. Слуцк, ул. Тутаринова, д. 19А/20 | 58 629,06 | 5862,91 | 2931,45 |
| 3 | **ЛОТ № 3,** в составе: 1. Капитальное строение с инв. № 640/С-26506, площадь – 2 627,4 кв. м, назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – блок складов; 2. Капитальное строение с инв. № 640/С-84142, площадь – 267,1 кв. м, назначение – здание неустановленного назначения, наименование – лесосушильная установка; 3. Ограждение территории (5/100 доли); 4.Техническая площадка (17/100 доли). | Минская обл., г. Слуцк, ул. Тутаринова, д. 19А/17, 19А/18 | 141 288,62 | 14128,86 | 7064,43 |
| 4 | **ЛОТ № 4,** в составе: 1. Капитальное строение с инв. № 640/С-77256, площадь – 72,2 кв. м, назначение – здание неустановленного назначения, наименование – токарный цех; 2. Капитальное строение с инв. № 640/С-75441, площадь – 70,0 кв. м, назначение – здание неустановленного назначения, наименование – проходная; 3. Сооружение с инв. № 640/С-84133, высота – 20 м, назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – громоотвод; 4. Ограждение территории (8/100 доли); 5.Техническая площадка (7/100 доли) | Минская обл., г. Слуцк, ул. Тутаринова, д. 19А, 19А/6 | 18 405,08 | 1840,51 | 920,25 |
| 5 | **ЛОТ № 5,** в составе: 1. Сооружение с инв. № 640/С-84395, назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ, наименование – склад выгрузки металла; 2. Техническая площадка (6/100 доли) | Минская обл., г. Слуцк, ул. Тутаринова, д. 19А/13 | 36 246,12 | 3624,61 | 1812,31 |
| 6 | **ЛОТ № 6,** в составе: 1. Капитальное строение с инв. № 640/С-26498, площадь – 1 148,6 кв.м, назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – склад; 2. Техническая площадка (8/100 доли) | Минская обл., г. Слуцк, ул. Тутаринова, д. 19А/14 | 57 679,12 | 5767,91 | 2883,96 |
| 7 | **ЛОТ № 7,** в составе: 1. Сооружение с инв. № 640/С-77196, протяженность – 300,2 м, назначение – сооружение специализированное железнодорожного транспорта, наименование – повышенный ж/д путь; 2. Капитальное строение с инв. № 640/С-75442, площадь – 167,7 кв. м, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад цемента; 3. Сооружение с инв. № 640/С-84137, площадь – 76 кв. м, назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – участок выгрузки цемента; 4. Техническая площадка (5/100 доли); 5. Ограждение территории (28/100 доли) | Минская обл., г. Слуцк, ул. Тутаринова, д. 19А, 19А/18, /3 | 106 408,03 | 10640,80 | 5320,40 |
| 8 | **ЛОТ № 8,** в составе: 1. Капитальное строение с инв. № 640/С-75876, площадь – 645,2 кв. м, назначение – здание неустановленного назначения, наименование – здание пилорамы; 2. Сооружение с инв. № 640/С-84141, назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ, наименование – склад выгрузки пиломатериалов; 3. Сооружение с инв. № 640/С-84140, назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ, наименование – склад выгрузки леса; 4. Сооружение с инв. № 640/С-77216, протяженность – 413,1 м, назначение – сооружение специализированное железнодорожного транспорта, наименование – рельсы ж/д пути; 5. Техническая площадка (7/100 доли); 6. Ограждение территории (9/100 доли) | Минская обл., г. Слуцк, ул. Тутаринова, д. 19А/7, /6, /5 | 91 989,53 | 9198,95 | 4599,48 |
| 9 | **ЛОТ № 9,** в составе: 1. Капитальное строение с инв. № 640/С-75439, площадь – 1 562,2 кв. м, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – складское помещение; 2. Техническая площадка (11/100 доли); 3. Ограждение территории (6/100 доли). | Минская обл., г. Слуцк, ул. Тутаринова, д. 19А/8 | 71 126,69 | 7112,67 | 3556,33 |
| 10 | **ЛОТ № 10,** в составе: 1. Капитальное строение с инв. № 640/С-26500, площадь – 47,0 кв. м, назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – АЗС; 2. Техническая площадка (5/100 доли); 3. Ограждение территории (3/100 доли) | Минская обл., г. Слуцк, ул. Тутаринова, д. 19А/9 | 10 909,46 | 1090,95 | 545,47 |
| 11 | **ЛОТ № 11,** в составе: 1. Капитальное строение с инв. № 640/С-75437, площадь – 85,6 кв. м, назначение – здание неустановленного назначения, наименование – сушилка; 2. Сооружение с инв. № 640/С-84136, назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – эстакада; 3. Сооружение с инв. № 640/С-77236, объем – 45 куб. м, назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – пожарный резервуар; 4. Техническая площадка (9/100 доли); 5. Ограждение территории (7/100 доли). | Минская обл., г. Слуцк, ул. Тутаринова, д. 19А/12, Б | 22 412,63 | 2241,26 | 1120,63 |
| 12 | **ЛОТ № 12,** в составе: 1. Ограждение (инв. № 640/С-78876) (18/100 доли). | Минская обл., г. Слуцк, ул. Тутаринова, д. 19А | 1335,85 | 133,59 | 66,79 |
| 13 | **ЛОТ № 13,** в составе: 1. Техническая площадка (инв. № 640/С-78877) (16/100 доли). | Минская обл., г. Слуцк, ул. Тутаринова, д. 19А | 26 598,30 | 2659,83 | 1329,92 |

***В отношении вышеуказанных лотов проводятся третьи повторные торги. Окончание приема заявлений в 18.00 14.10.2019.***

Публикация об аукционе ранее размещалась в газете «Рэспубліка» 02.03.2019 г.; в газете «Звязда» № 110 14.06.2019 г., № 138 25.07.2019 г.

ЛОТ № 1 – Капитальное строение с инв. № 640/С-26504, площадь – 1 868,3 кв. м, назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – ремонтно-механическая мастерская находится в залоге у ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск.

Все вышеуказанные лоты расположены на земельном участке площадью 7,3392 га с кадастровым номером 624650100001006612. Целевое назначение – земельный участок для содержания и обслуживания зданий и сооружений производственной базы. Право постоянного пользования. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

УСЛОВИЯ

Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано единственным участником, либо единственный участник явился для участия в аукционе и он согласен приобрести Объект (Объекты) по начальной цене, увеличенной на 5 % (пять процентов), – Претендент на покупку должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта (Объектов) после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, затрат на публикацию в течение 14 (четырнадцати) дней со дня проведения аукциона.

Оплата приобретенного на аукционе Объекта (Объектов) производится в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее 30 (тридцати) дней со дня проведения торгов.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона и затраты по размещению публикации в газете и на сайте bankrot.gov.by на основании счета-фактуры в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона.

На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона.

**Аукцион состоится 16.10.2019 в 15.00 (регистрация участников с 14.30 до 14.50) по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127.**

Порядок оформления участия в аукционе, критерии выявления победителя торгов и порядок оформления результатов торгов содержатся на сайте https://sites.google.com/site/pcjuristcom/torgi.

До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с BY36ALFA30122215570040270000 в Отделении «На Красной» ЗАО «Альфа-Банк», код банка ALFABY2X, УНП 192789344.

Получатель – ООО «Фрондера». Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества ГП «СУТПК» (Лот № __), проводимом 16.10.2019 г.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1121.

Все желающие могут предварительно ознакомиться с лотами. Контактное лицо для осмотра: 8 029 691 36 99 (Александр Владимирович).

Организатор аукциона вправе после опубликования извещения о проведении аукциона отказаться от его проведения в любое время, но не позднее чем за пять дней до наступления даты его проведения. Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)».

**Организатор аукциона – ООО «Фрондера»: ☎ 8 (029) 305-86-50 ● e-mail: frondera@mail.ru**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «БРЕСТСКИЙ ЭЛЕКТРОТЕХНИЧЕСКИЙ ЗАВОД»

**Предмет торгов – Лот:**

1) Капитальное строение с инвентарным номером 100/С-28842 (наименование: механический цех; назначение: здание специализированное для производства электротехнического, электронного и оптического оборудования), площадью 945,4 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Брест, пер. Фортечный, 1/3, механический цех, на земельном участке с кадастровым номером 140100000001010166, площадью 1,0055 га.

Составные части и принадлежности: кабель АВБ 3х120+1х50, кабель АПВБ 3х150+1х75;

2) Капитальное строение с инвентарным номером 100/С-28853 (наименование: здание веерное; назначение: здание специализированное железнодорожного транспорта), площадью 928,3 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Брест, пер. Фортечный, 1, здание веерное, на земельном участке с кадастровым номером 140100000001010166, площадью 1,0055 га.

Составные части и принадлежности: две пристройки, подъездной ж/д путь, подкрановый путь, покрытие из бетонных плит, ограждение железобетонное, двое ворот металлических, ограждение из ж/б плит на ж/б столбах, кабель АВБ 3х120+1х50;

3) Капитальное строение с инвентарным номером 100/С-5048 (наименование: склад; назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ), площадью 233,7 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Брест, пер. Фортечный, 1/6, на земельном участке с кадастровым номером 140100000001010166, площадью 1,0055 га.

4) Капитальное строение с инвентарным номером 100/С-28849 (наименование: уборная; назначение: здание специализированное иного назначения), площадью 5,3 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Брест, пер. Фортечный, 1/2, на земельном участке с кадастровым номером 140100000001010166, площадью 1,0055 га.

5) Капитальное строение с инвентарным номером 100/С-28836 (наименование: проходная; назначение: здание специализированное иного назначения), площадью 26,1 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Брест, пер. Фортечный, 1/1, на земельном участке с кадастровым номером 140100000001010166, площадью 1,0055 га.

6) Капитальное строение с инвентарным номером 100/С-28847 (наименование: компрессорная; назначение: здание специализированное иного назначения), площадью 33,2 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Брест, пер. Фортечный, 1/4, компрессорная, на земельном участке с кадастровым номером 140100000001010166, площадью 1,0055 га.

Составные части и принадлежности: кабель АПРГ 3х50+1х25;7) Капитальное строение с инвентарным номером 100/С-89905 (наименование: тепловая сеть; назначение: сооружение специализированное коммунального хозяйства), протяженностью 21,0 м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Брест, пер. Фортечный, 1/1, тепловая сеть.

Составные части и принадлежности: участок тепловой сети;

8) Капитальное строение с инвентарным номером 100/С-89906 (наименование: тепловая сеть; назначение: сооружение специализированное коммунального хозяйства), протяженностью 18,6 м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Брест, пер. Фортечный, 1/4, тепловая сеть. Составные части и принадлежности: участок тепловой сети;

9) Капитальное строение с инвентарным номером 100/С-89907 (наименование: сети питьевого водоснабжения; назначение: сооружение специализированное коммунального хозяйства), протяженностью 15,7 м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Брест, пер. Фортечный, 1/3, сети питьевого водоснабжения.

Составные части и принадлежности: два трубопровода;

10) Капитальное строение с инвентарным номером 100/С-89908 (наименование: сети технического водоснабжения; назначение: сооружение специализированное коммунального хозяйства), протяженностью 65,4 м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Брест, пер. Фортечный, 1, сети технического водоснабжения.

Составные части и принадлежности: участок сети технического водоснабжения

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Начальная цена, руб. (без учета НДС)** | **294 5 04,80** | **Размер задатка, руб.:** | **29 450,48** |

**Продавец:** ОАО «Брестский электротехнический завод» г. Брест, ул. Строительная, 56, УНП 200215500.

**Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки».

**Реквизиты для перечисления задатка:** р/с BY76BPSB30121789380179330000 в ОАО «БПС-Сбербанк» Региональная дирекция № 100 по Брестской области, BIC Банка BPSBBY2X, УНП 201028245.

**Обременения:** на земельном участке с кадастровым номером 140100000010101066, находящемся по адресу: Брестская обл., г. Брест, пер. Фортечный, 1, расположено капитальное строение с инвентарным номером 100/С-83788 (наименование: тепловая сеть (часть 2); назначение: сооружение коммунального хозяйства), протяженностью 149,5 м, переданное ОАО «Брестский электротехнический завод» по договору безвозмездного пользования имуществом.

**Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 20 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.**Условия продажи:** без условий. **Условия оплаты:** в соответствии с заключенным договором купли-продажи.

**Аукцион состоится 15 октября 2019 г. в 14.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325.**

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10, 329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00. Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, можно узнать у организатора аукциона по телефонам: 8-(0162)-20-92-13, 21-88-81, 8-(029) 626-72-52.

Последний день приема заявлений – 14 октября 2019 г. до 17.00

Участник аукциона, выигравший торги, оплачивает продавцу НДС в размере 20 % от продажной стоимости объекта, вознаграждение Организатору аукциона.

Ранее извещение о продаже имущества ОАО «Брестский электротехнический завод» опубликовано в газете «Звязда» от 24.08.2019.

## Вниманию предприятий, организаций и индивидуальных предпринимателей!

Комитетом государственного имущества Гродненского областного исполнительного комитета проводятся аукционы по продаже неиспользуемого имущества, находящегося в собственности Волковысского района.

К ПРОДАЖЕ ПРЕДЛАГАЕТСЯ:

Комплекс объектов производственной базы в г. Волковыске по ул. Матросова, 6, 6/1, 6/2.

Начальная цена предмета аукциона – 96 574 руб. 50 коп.

Размер задатка – 10 000 руб.

Аукцион состоится – **31 октября 2019 г. в 11.30.**

Заявки на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39.

Последний день подачи заявлений на участие в аукционе – **25 октября 2019 года до 17.00.**

Подробная информация по телефонам:

в городе Волковыске – 8 (01512) 4 50 25, 2 06 03.

в городе Гродно – 8 (0152) 77 29 15, 72 25 18, 72 21 02

Сайты: www.region.grodno.by, gki.gov.by

УНП 500042135

Утерянный представительством Белгосстраха по Октябрьскому району г. Минска бланк строгой отчетности квитанции о приеме наличных денежных средств (страховых взносов) формы 1 СУ серии СВ № 5749983 **считать недействительным.** УНП 100122726

# «ПАТЭНЦЫЙНА БЕЛАРУСКІЯ ФІЛЬМЫ ДОБРЫЯ ЎЖО ТАМУ, ШТО ЯНЫ БЕЛАРУСКІЯ»

**Вялікая справа. Два прафесійныя польскія сцэнарысты і рэжысёры са знакамітай Школы Вайды прыехалі ў Мінск, каб у адмысловай міжнароднай лабараторыі Cinema Lab разам з беларускімі фільммейкерамі разабраць іх свежыя кінапраекты. Работа працягвалася чатыры дні: Дэніял Хазановіч і Філіп Марчэўскі, кожны з вялікім досведам удзелу ў міжнародных кінафестывалях, прааналізавалі восем адабраных да ўдзелу сцэнарыяў беларускіх аўтараў і далі парады, як іх рэалізаваць. Сярод удзельнікаў — небезвядомыя ў нашай сферы кіно Андрэй Палупанаў, Дар'я Юркевіч, Сяргей Каласоўскі, Улада Сянькова, Андрэй Кашперскі, Нэла Васілеўская і іншыя. Такога кшталту адукацыя — неабходны, але рэдкі элемент беларускага кінапрацэсу. Адпаведна і цікавасць да лабараторыі з боку фільммейкераў аказалася высокай, пра што сведчыць больш за дваццаць заявак на ўдзел. Праект Cinema Lab арганізаваны Майстэрняй сацыяльнага кіно пры падтрымцы ЮНЕСКА. Па выніках лабараторыі ўдзельнікі змогуць зняць сцэну свайго будучага фільма, што дапаможа прасоўваць праекты на міжнародных пляцоўках і шукаць фінансаванне на пітчынгах. Мы ж распыталі Дэніяла Хазановіча і Філіпа Марчэўскага пра работу Cinema Lab, польскае кіно і напісанне сцэнарыяў.**



Фота Андрэя КАЛЕСНІКАВА.

**— Вы прааналізавалі некалькі беларускіх кінапраектаў. Як яны вам здаліся?**

**Ф.:** Мы пабачылі спектр разнастайных ідэй і густаў, бо праекты вельмі розныя — адны больш сур'ёзныя, другія больш камедыйныя.

**Д.:** Я сказаў бы, цікавымі і перспектыўнымі. Для нас было займальна даведацца, якія тэмы і праблемы натхняюць тутэйшых фільммейкераў, бо мы, прынамсі я, незнаёмыя з беларускім кіно. З пункту гледжання ўспрымання аўтарамі жыцця, рэальнасці і праблем, з якімі яны сутыкаюцца ў паўсядзённасці, для мяне работа ў лабараторыі стала адкрыццём новага акна. Удзельнікі праекта — маладыя, апантаныя і добра дасведчаныя ў мове кіно, што дапамагае нам, цьютарам, рабіць свaімі парадамі ўнёсак у іх праекты.

**— Існуе меркаванне, што можна прадбачыць, якія фільмы верагодней за ўсё будуць прынятыя міжнароднымі кінафестывалямі і атрымаюць на іх поспех. Калі праекты ўдзельнікаў лабараторыі будуць рэалізаваны, ці маюць яны шансы быць абранымі ў праграмы міжнародных кінафестываляў?**

**Д.:** Так, безумоўна.

**Ф.:** Некалькі праектаў маглі б вельмі зацікавіць міжнародныя кінафестывалі. Бо што нас прыцягвае? Тое, што мы не ведаем дастаткова добра, а пра жыццё ў Беларусі мы ведаем няшмат. З другога боку, ёсць універсальныя тэмы: у праектах, якія мы разбіралі, яны акружаныя рэчаіснасцю і паўсядзённым жыццём краіны, а гэта добрая сумесь. Напрыклад, мы разглядалі праект кароткаметражнага фільма пра адносіны дзяўчыны і яе бацькі: як яны камунікуюць, што паміж імі адбываецца, наколькі ён прыдатны да ролі таты і гэтак далей, дык вось для гэтага фільма знайсці гледача можна дзе заўгодна. Памятаю, падчас інтэрв'ю амерыканскаму выданню наконт адной маёй кароткаметражнай карціны, што была зазнаваная, як мне здавалася, на вельмі польскім матэрыяле, я зразумеў, што тая ж гісторыя магла здарыцца ў Нью-Ёрку, і ў рэшце рэшт атрымаў аднолькавыя каментарыі з Японіі і, скажам, Бразіліі. Абсалютна розныя культуры могуць зразумець пачуцці маладога хлопца, як у выпадку з маім фільмам, альбо маладой дзяўчыны, як у выпадку са згаданым сцэнарыем. На варкшопе мы маглі ўбачыць захапленне фільммейкераў і адчулі, што гісторыі, якія яны прадстаўляюць, важныя для іх, а калі тэма важная для сцэнарыста альбо рэжысёра, фільм, у адрозненне ад тых, дзе прысутнічае модная тэма, але адсутнічае заўзятасць, можа стаць такім і для гледача.

**— Значыць, фільмы з Беларусі могуць прываблівць у першую чаргу таму, што мала хто ведае, што тут адбываецца?**

**Ф.:** Не, канешне, не толькі па гэтай прычыне. У многіх краінах, маёй таксама, людзі думаюць, што іх паўсядзённае жыццё нецікавае іншым, таму спрабуюць капіраваць галівудскія фільмы. Копія — заўсёды копія, калі мы паказваем людзей, якіх насамрэч не ведаем, мы не можам быць пэўныя ў тым, як яны павінны адчуваць сябе, рэагаваць і гэтак далей. А калі ты здымаеш кіно з твайго асабістага пункту гледжання і маеш справу са светам, людзьмі і эмоцыямі, якія добра ведаеш, то можаш зрабіць свой фільм прывабным для іншых. Для сцэнарыстаў і рэжысёраў вельмі важна ўсведамляць, што паўсядзённае жыццё можа быць цікавае, нават калі табе яно падаецца руцінай.

**Д.:** Я згодны, што беларускія фільмы цікавыя ў першую чаргу тым, што яны беларускія. Ніхто не захоча глядзець беларускае кіно, зробленае як японскае, — у гэтым няма сэнсу. Мы хочам даведацца пра культуру, грамадства ды людзей і знайсці розніцу паміж імі і намі. Таму сапраўды, патэнцыйна яны добрыя ўжо толькі таму, што беларускія.

**Ф.:** Гэта прыблізна тое ж самае, што адбылося з польскім кіно, якое сёння з'яўляецца даволі паспяховым, прычым паспяховымі становяцца фільмы, дзе ёсць універсальныя рэчы, але якія гавораць пра Польшчу, у гэтым ёсць нейкая праўда. На нашай лабараторыі мы таксама бачым, што аўтары спрабуюць знайсці тое, што будзе цікава для іх, а значыць, і для іншых.

**— Калі вы маеце гатовы сцэнарый у Польшчы, якія магчымасці ў вас ёсць, каб запусціць яго ў работу?**

**Д.:** У нас ёсць Польскі кінафонд PISF, куды мы можам падаць заяўку на фінансаванне. Таксама можна падавацца на дзяржаўнае тэлебачанне і прыватныя тэлеканалы, апроч гэтага, шукаць грошы за мяжой, што з'яўляецца тыповай опцыяй, каб дапоўніць бюджэт. У Польшчы ёсць і рэгіянальныя кінафонды.

**Ф.:** Вядома ж, ёсць багатыя фонды і тыя, што не маюць дастаткова грошай, але, тым не менш, калі ты здымаеш у пэўным рэгіёне, рэгіянальны кінафонд можа вельмі дапамагчы зрабіць тваю задуму рэальнай.

**Д.:** Фонды працуюць не толькі з поўнаметражнымі ігравымі фільмамі, але таксама з дакументальнымі і кароткаметражнымі. У цэлым сітуацыя на сённяшні дзень добрая, дзякуючы гэтым інстытуцыям мы маем вялікую аддачу, бо да таго, як яны былі заснаваныя, польскае кіно знаходзілася ў складаным становішчы, здымалася невялікая колькасць фільмаў, ды і яны не мелі поспеху. Разам з гэтымі інстытуцыямі была створана цэлая сістэма фінансавання і прамоцыі, і ўжо праз два-тры гады прагрэс быў заўважны.

**Ф.:** Усё змянілася вельмі хутка, і публіцы гэта бачна. Калі раней у Польшчы здымалася сем фільмаў у год, то цяпер шэсцьдзясят. Вядома ж, сярод іх ёсць як добрыя, так і дрэнныя карціны, але ў кііндустрыі не бывае, каб кожны праект быў паспяховы, гэта ж не вырабы са шкла.

**Д.:** Для кінапрацэсу таксама важна, каб крок за крокам развіваліся адукацыйныя магчымасці для маладых сцэнарыстаў, рэжысёраў, мантажораў і гэтак далей. У Польшчы мы маем усё больш і больш варкшопаў, прыкладаў супрацоўніцтва паміж кінашколамі і фондамі, бо ўся сістэма кіруецца задачай зрабіць прафесійны ўзровень кінаспецыялістаў вышэйшым. Думаю, такія лабараторыі, як гэтая, неабходны беларускаму кіно, яе арганізатары робяць сапраўды важную справу. Мы пачалі такога кшталту рэчы прыблізна сямнаццаць гадоў таму, і ўнёсак у якасць кіно аказаўся вялізны.

**Ф.:** Нам, сцэнарыстам і рэжысёрам, патрэбен нехта, густу і ведам каго мы давяраем, каб з ім пагаварыць. Я памятаю, як два гады таму пераможца Фестывалю польскага ігравога кіно ў Гдыні атрымаў узнагароду і паехаў вучыцца ў Школу Вайды, каб працаваць над сваім наступным фільмам. У нашай школе можна сканцэнтравацца на праекце і за год навучання прыйсці ад ідэі да сцэнарыя — думаю, гэта карысна для аўтараў.

**Д.:** Важна, што, маючы сучасныя тэхналогіі, ты ўжо не павінен мець дарагую тэхніку, каб удзельнічаць у варкшопах, а варкшоп — гэта сэрца кінаадукацыі, таму што пісаць сцэнарый і здымаць фільм ты вучышся не па кніжках — яны не дапамогуць, — а толькі праз практыку. З удзельнікамі лабараторыі мы аналізавалі іх праекты, вызначалі аўдыторыю, разбіралі моцныя бакі і як могуць быць палепшаны слабыя — такі кшталт навучання недарагі, але з'яўляецца надзённым хлебам для якаснага кіно.

**Ф.:** Для любой пабудовы надзвычай важнай часткай з'яўляецца фундамент — ён нябачны і, можа быць, не вельмі прывабны, але без яго ўсё разваліцца. Работа лабараторыі працягваецца некалькі дзён, і ўжо на другі дзень тыя, хто меў прэзентаваць свае праекты, на аснове разбору папярэдніх сцэнарыяў хацелі нешта памяняць у сваіх.

**— На жаль, у Беларусі няма кііндустрыі ў поўным сэнсе гэтага слова. У нас кажуць, што краіна — проста недастаткова вялікі рынак. Вы думаеце, гэта сапраўды можа перашкаджаць развіццю кіно?**

**Д.:** Чэхія — прыблізна такі ж па аб'ёме рынак, а паглядзіце на яе. Да таго ж, наколькі я зразумеў, дзякуючы рускай мове вы маеце вялікія магчымасці, звязаныя з Расіяй.

**Ф.:** Напрыклад, у Даніі насельніцтва нават меншае, але яны ведаюць, што не трэба разлічваць толькі на лакальны рынак, у выніку іх фільмы паказваюцца паўсюль.

**— Я неаднаразова чула меркаванне, што сёння адчуваецца недахоп добрых сцэнарыяў. Вы згодны?**

**Д.:** У тых, хто гэта кажа, трэба запытацца, колькі яны плацяць за сцэнарый і колькі часу трэба, каб яго напісаць, потым раздзяліць гэтыя грошы на колькасць месяцаў, і тады вы зразумееце, чаму колькасць добрых сцэнарыяў такая маленькая. Калі ты хочаш мець нешта якаснае, на жаль, трэба заплаціць. Гэта вельмі проста. Калі я нешта не разумею і праводжу «даследаванне», звычайна ў рэшце рэшт усё роўна прыходжу да высновы, што прычына ў грашах.

**— Колькі каштуе прафесійны сцэнарый у Польшчы?**

**Д.:** У сярэднім шэсцьдзясят тысяч злотых, то-бок прыкладна 15 тысяч еўра. Каб напісаць яго, трэба мінімум два з паловай гады — атрымліваецца 700 еўра ў месяц. Гэта мала, асабліва калі ў цябе сям'я.

**— Што неабходна для напісання арыгінальнага сцэнарыя, калі, здаецца, кіно ўжо ўсё паказала?**

**Д.:** У пэўным сэнсе тое, што ўсё, маўляў, ужо сказана, — праўда. Але адзінота пяцьдзясят гадоў таму абсалютна адрозная ад таго, што такое адзінота сёння. Увесь час мы пераасэнсоўваем рэальнасць і свой досвед. Свет мяняецца імкліва: успомніце фільм «Шоу Трумана» — яго галоўны герой у выкананні Джыма Кэры збягае, калі разумее, што ўвесь час яго здымае камера, а сёння людзі хочуць, каб іх здымалі. Прайшло толькі дваццаць гадоў.

**Ф.:** Дзесяць гадоў таму мы таксама думалі, што ўсё ўжо паказана, а да гэтага ўсё было напісана. Але ў кожнага пакалення з'яўляецца прастора, каб адлюстраваць свой пункт гледжання на тэмы, што існуюць тысячы гадоў. Гэта значыць пошук свайго спосабу рабіць кіно: кожнае пакаленне мае сваю мову і сваё ўспрыманне. Пэўныя тэмы, элементы штодзённасці, прырода чалавека, сацыяльныя пытанні з уласнага пункту гледжання сучасных аўтараў будуць іншымі.

**Гутарыла**
**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**


**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «БРЕСТСКИЙ ЭЛЕКТРОТЕХНИЧЕСКИЙ ЗАВОД»**

| Наименование объекта | Начальная цена продажи, руб. без НДС | Размер задатка, руб. |
|---|---|---|
| **ЛОТ № 1** – Грузовой седельный тягач MAZ 5432 A3 322, год выпуска 2009 г., регистрационный знак АВ 7440-1, кузов № Y3M5432A390001147 | **4 000,00** | **400,00** |
| **ЛОТ № 2** – Полуприцеп бортовой MAZ 93802 0 041, год выпуска 2009 г., регистрационный знак А 8222 А-1, кузов № Y3M93802090000899 | **2 080,00** | **208,00** |
| **ЛОТ № 3** – Полуприцеп бортовой MAZ 938660 043, год выпуска 2007 г., регистрационный знак 2457 АА-1, кузов № Y3M93866070007845 | **2 960,00** | **296,00** |
| **ЛОТ № 4** – Грузовой бортовой тентовый MAZ 437143 332, год выпуска 2011 г., регистрационный знак AI 0151-1, кузов № Y3M437143B0001211 | **4 080,00** | **408,00** |

**Продавец:** ОАО «Брестский электротехнический завод», г. Брест, ул. Строительная, 56, УНП 200215500. **Организатор аукциона:** РУП «Институт недвижимости и оценки» Брестский филиал.
**Р/с для перечисления задатка:** р/с BY76BPSB30121789380179330000 в ОАО «БПС-Сбербанк» Региональная дирекция № 100 по Брестской области, г. Брест, ул. Мицкевича,10, BIC Банка BPSBBY2X, УНП 201028245.
**Срок заключения договора купли-продажи:** не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона. **Условия оплаты:** в соответствии с заключенным договором купли-продажи. **Условия продажи:** без условий

Аукцион состоится 15 октября 2019 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10 – 325 Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

Перечень документов для участия в аукционе и иную информацию можно узнать по телефонам: 8 (0162) 20-92-13; 21-88-81, 8 029 626 72 52

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10, каб. 329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00. Последний день приема заявлений – 14 октября 2019 г. до 17.00

Участник аукциона, выигравший торги, оплачивает продавцу НДС в размере 20 % от продажной стоимости объекта, а также возмещение затрат Организатору аукциона

Ранее извещение о продаже имущества ОАО «Брестский электротехнический завод» опубликовано в газете «Звязда» от 16.08.2019.

# «МУЖ ЗВАНІЎ З КАМАНДЗІРОЎКІ, ШТО КУПІЎ САБЕ АБНОЎКІ...»

**Што было — было. Адзін гаспадар вельмі доўга планаваў, збіраўся, рыхтаваўся да рамонту ў кватэры. Але ж вось, нарэшце, купіў матэрыялы, на сярэдзіну пакоя сцягаў мэблю, усё панакрываў, а сам — з бляшанкай фарбы — залез на драбінку і столь фарбуе. Ды так жа акуратна, старанна... Жонка — не налюбуецца! Кажа: «Бачыш, сынок, які наш татка малайчына! Вучыся! Калі падрасцеш, дапамагаць яму будзеш!» — «А ён, што, сам да таго часу не ўправіцца?» — з насцярогай пытае малы.**
**Трэба разумець, нават ён здагадваецца, за якую складаную справу ўзяўся ягоны бацечка!**



Што да чытачоў «Звязды», то яны гэтым разам строілі здагадкі пра «цётачку». Можна яшчэ раз глянуць на яе — гаротніцу — ды згадзіцца са **спадаром Гаўрышам з Чавусаў**: хто рамонтам не займаўся, той гора не ведаў. Вось і гэта бландзінка, маўляў, распачала яго, улезла ў нерат, а што далей...

Вершаваным радком гэта апісана так:

*Не мела дзеўка клопату,*
*Прадаўшы парася,*
*У малярства (ды без вопыту)*
*Заглыбілася ўся...*
*Сядзіць цяпер — гаруе:*
*— Ну дзе ж былі мазгі?!*
*І сцен не дафарбую,*
*І як аддаць даўгі?!*

Праблемы? Так. І каб толькі гэтыя, а то ж, паводле **спадара Гаўрыша,**

*Пачала рамонт*
*кватэры, —*
*Мігам зніклі кавалеры...*
*Ты ж —*
*як хочаш:*
*клей шпалеры,*
*Столь бялі*
*і вешай дзверы,*
*Мяняй плітку, унітаз...*
*Ці хаця б —*
*не засмучайся:*
*У аб'явы ўчытайся:*
*Можа, прыйдзе...*
*муж на час?*

Ёсць, ёсць такая паслуга! І прапаноў — шмат: дастаткова пазваніць, і мігам знойдуцца, прыйдуць дабравольцы: люстры, карнізы, карціны павесяць, краны паправяць, мэблю збяруць... Часам (за вашы грошы) нават з'ездзяць на лецішча: ускапаюць грады, скосяць газоны, паправяць платы...

Ну і з рамонтам, відаць, дапамогуць. Галоўнае — не памыліцца, не замахнуцца на нешта іншае, а то...

Праўдзівая, трэба разумець, гісторыя: адзін стары халасцяк у газеце абвестку ўбачыў — «Жонка на час» і...

Проса сніцца галоднай курыцы — усё зразумеў пасвойму: набраўся смеласці, пазваніў. «Для якіх патрэб выклікаеце?» — папыталіся ў яго з таго канца провады (і голас такі ж прыемны, малады...). «Хачу парадак у сябе навесці, — не разгубіўся халасцяк. — Пажадана ўвечары». Яму ў адказ — парадак дык парадак, вечарам дык вечарам. Дамовіліся, калі канкрэтна... Ён торт купіў, кветкі, шампанскае — усё, карацей, як належыць, як у кніжках чытаў, як у серыялах бачыў...

У прызначаны час — званок у дзверы. Ён, узрушаны, адчыняе. А там — сімпатычная бабулька з вядром і шваброй. Кажа: «Ну, дзе тут што прыбіраць?»

Прыйшлося паказаць і пачак цыгарэт на балконе скурыць, пакуль «госця» гаспадарыла. Гляну потым, што атрымалася, — не пазнаў бярлогу!... А таму не проста заплаціў, а яшчэ і прэмію той «жонцы» выпісаў — у выглядзе торта.

Бабуля ўдзячная была. Сказала на адыход: «Жонку табе трэба, сынок».

Ну, «сынкам» (то-бок мужчынам) з гэтым, кажуць, прасцей: яны жэняцца, калі захочуць, а вось «дачушкам» — горш, бо замуж ідуць, калі клічуць-бяруць. А значыць,

*Здымак —*
*тэст для жаніхоў.*
*Бізнес-лэдзі?*
*Ёсць «улоў»!*
*А рабочая апратка*
*І — на жаль —*
*Не ўсё так гладка.*

Лічыць **спадарыня Іна Алісевіч з Уздзеншчыны.** І, відаць, мае рацыю: адна бландзінка — няма ахвотных падсесці...

Чаму так адбываецца, ведае **спадар Мікалай Старых з Гомеля:** «У сярэдзіне мінулага стагоддзя пра Яго Вялікасць рабочы клас (я без іроніі, зазначае аўтар) паказвалі шмат добрых фільмаў: «Вышыня», «Вялікі перапынак», «Вясна на Зарэчнай вуліцы»... На слыху былі песні «А мы монтажники-высотники», «Уральская рябинушка» («...Справа кудри токаря, слева — кузнеца...»), нават Мікалай Слічэнка спяваў пра маляра... А цяпер, апроч «шофёра-дальнобойщика», і прыгадаць няма чаго. Можа, таму і па́дае прэстыж рабочых прафесій, можа, таму і...

*Маляра, красуню Леру,*
*Пакідаюць кавалеры.*
*Канстанцін пайшоў*
*да Танькі,*
*Бо яна працуе ў банку.*
*Павел —*
*у дакторкі Томы*
*(Тая носіць*
*спірт дадому).*
*Не злажылася*
*й з Антосем, —*
*Паху фарбы*
*не выносіць.*

Гора ў дзеўкі! Няёмка ёй, што мае такую прафесію, схавала, бач, твар. Хоць сама ж ва ўсім вінавата, як лічыць **спадар Мікола Кісель з Мінска:**

*На танцулькі бегла*
*Заміж навучання*
*І на сэрца легла*
*Ранняе каханне.*
*Зараз — клей,*
*шпаклёўка,*
*Як празнае маці...*
*Мілая галоўка,*
*Дай цябе абняці!*

Бо шкада. Яшчэ і таму... Кароткі, але ж досыць дакладны подпіс ад **спадарыні Валянціны Гудачковай з Жыткавічаў:**

*Атруціў дзеўку*
*Фарбай ды пабелкай.*

А маглі і не толькі...

Праўдзівая гісторыя ад **спадарыні Любові Чыгрынавай з Мінска:**

*Працавала аж да поту,*
*Парабіла ўсю работу,*
*Часам —*
*цераз «не магу»...*
*Ды заказчык*
*быў нягожы,*
*Усё крывіўся:*
*непрыгожа...*
*А ўрэшце —*
*абдурыў:*
*Як найменей заплаціў!*

Ну, ці не падлюка?!

«Гэты конкурсны здымак, — ужо празой дадае шаноўная аўтарка, — нагадаў мне адну сямейную пару. Немаведама якім чынам, але ў смутныя часы яна ўзбілася на грошы, стала будаваць сабе дом. І гаспадар у гэтых работах хоць трохі ды разбіраўся, а вось жонка яго і сама не ведала, чаго хоча: каб найлепей! Каб «як ні ў кога!» Сцены, хвалілася, аж шэсць разоў фарбавалі!»

Адкуль:

*Распышэлі*
*Тома*
*з Грышам:*
*Мы сгоніны*
*нуварышы,*
*Трэба нам*
*такі палац,*
*Што не мела*
*нават знаць...*
*І муштруюць*
*рабацяг:*
*Тут не гэтак,*
*там не так.*
*Заганялі —*
*да знямогі:*
*Не дай божа*
*свінням рогі!*

Бо іх, «рагатых», як той казаў, хлебам не кармі, — дай «крыві папіць», дай некага падмануць, знявачыць...

Расказвалі, адзін вось такі пад канец рабочага дня на аб'екце з'явіўся. Бачыць: на гадзінніку яшчэ 20 хвілін працаваць, а маляры ўжо рыштунак збіраюць. «Як так?.. Чаму рана?!» — крычыць на ўсю глотку. «Дык трэба інструмент памыць, — адказвае нехта, — падлогу падмесці, смецце выкінуць...» — «І на гэта — 20 хвілін?! Я за мінуту дамоў збіраюся!» Маляры ў адказ: «Што вам збіраць? Рот закрыў ды пайшоў».

А раніцай — трэба разумець — адкрыў... І пытанне (на думку **спадара Мікалая Касмачэўскага з Навапалацка)** тут толькі ў адным: своечасова, ці не, бо

*Калі майстар*
*затрымаўся,*
*Люд рабочы...*
*адаспаўся:*
*Тут, дарэчы, як нідзе:*
*Спіць маляр,*
*а «служба» йдзе.*

Кажаце, для сну не камфортнае месца? Ды як паглядзець?

*Напрацуецца жанчынка,*
*Дык і лаўка, як пярынка:*
*Села трошкі адпачыць,*
*А тым часам*
*ужо й спіць.*

Можа, нават сон нейкі ўбачыць... І **спадарыня Гудачкова** здагадваецца, які:

*Прысніцца ёй*
*не рокат касмадрома,*
*А... счахлая трава —*
*(і сёння зноў?!).*
*У зелень*
*яе красіць ім па новай,*
*Бо едуць*
*правяральшчыкі*
*з «вярхоў».*

Ну, што рабіць — традыцыя: не факт, што з найсвятлейшага князя Пацёмкіна яна пачалася, і вельмі мала надзей, што пры жыцці нашым скончыцца... Як, на жаль, і вось гэта (з «падачы» **спадара Касмачэўскага):**

*Муж званіў*
*з камандзіроўкі,*
*Што купіў сабе абноўкі...*
*Ёй жа*
*трэба столь бяліць,*
*А галовачка —*
*баліць:*
*Для каго*
*ён там прыбраўся?*
*Мо, крый божа,*
*закахаўся?*
*Што ён есць?*
*Дзе ляжа спаць?*
*Як дадому прычакаць?!*

І не кажы, кума! Бо вельмі шмат хто без слоў усё зразумее: вунь колькі нашых мужчын (ды і жанчын) у розныя камандзіроўкі ездзяць. Нехта — на дзень ці на тыдзень, а некага — па паўгода дома няма. Як тут не хвалявацца? (Адна бландзінка другой: «Ты ўяўляеш, я нядаўна даведалася, што ў майго мужа палюбоўніца ёсць, што ён мне здраджвае... Як ты думаеш, яму пра гэта сказаць?» Другая ў адказ: «А навошта? Я думаю, ён і сам гэта ведае».)

А веды і сапраўды — сіла. Сваімі, трохі сумнымі, пра лёс нашай дзяўчыны — з ахвотай падзяліўся **спадар Валерый Гаўрыш:**

*Як вавёрка ў дзікім коле*
*Усё па крузе...*
*Болей, болей:*
*Там катэдж*
*пафарбаваць*
*Там фазэнду*
*тынкаваць...*
*І ў сям'і на пабягушках,*
*Нібы тая Папялушка...*
*Застаюцца недзе*
*ў марах*
*Нарач, Браслаў*
*ці Канары.*

Дык мо і сапраўды варта запаволіць свой бег, а то і зусім (парада **спадарыні Гудачковай**)... спыніцца?

*Фарбы*
*скончыліся...*
*Гальцы*
*Пасядзець бы*
*дзе на лаўцы:*
*Краявіды,*
*без запросін,*
*Размалюе*
*фея восень.*

Яна, згадзіцеся, гэта можа... і робіць! Прычым так... Ні адзін маляр не дакажа, хоць (на думку **сужэнцаў Астроўскіх з Мінска)** многія і стараюцца:

*Маляроў*
*у нас шануюць,*
*Справы іх —*
*навідавоку:*
*Папрацуюць,*
*пафарбуюць, —*
*Прыгажосць!..*
*Відаць здалёку!*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

З таго ж канверта (і пазамежамі конкурсу, бо гэта хутчэй думкі з нагоды, а не подпіс да здымка) балючае:

*Беларуссю*
*ганарымся —*
*Прыгажосцю, чысцінёй...*
*А спытайцеся*
*ў Марысі, —*
*Яна скажа:*
*«Бог ты мой!*
*Падмятаю,*
*смецця — кучы*
*Пасля ночы*
*скрозь ляжаць...*
*Як прымусіць?*
*Хто навучыць*
*За сабою прыбіраць?*
*Колькі ж*
*трэба пакаленняў?*
*І якіх кіраўнікоў,*
*Каб ачнулася сумленне,*
*Каб змяніць,*
*як кажуць, кроў?..»*

Складаныя пытанні, і пра адказы на іх мы падумаем заўтра. Сёння ж — «кропачка», ад **сужэнцаў Астроўскіх:**

*Што маляр*
*на лаўцы робіць,*
*Знаць, вядома ж,*
*не зашкодзіць....*
*А вось вёдры,*
*што мы бачым,*
*Вельмі зручныя на дачы.*

Хто б спрачаўся, — мы не будзем: завершаны там чарговы сельскагаспадарчы сезон, сабраны ўраджай, падведзены вынікі.

Вось і мы пра іх. Такім чынам, паводле меркаванняў вялікага чытацкага журы, найлепшыя радкі да мінулага здымка (на ім — гл. нумар «Звязды» за 21 жніўня — быў малады чалавек у трусах і процівагазе), склалі **спадары Іван Сіманёнак з Паставаў, Валерый Гаўрыш з Чавусаў, Віктар Сабалеўскі з Узды, Мікола Кісель і сужэнцы Астроўскія з Мінска, спадарыня Галіна Пятроўская са Смаргоншчыны, Валянціна Гудачкова з Жыткавічаў і Любоў Чыгрынава...** Яе крылатае:

*Не пабіла грады*
*градам,*
*Не пужаў*
*нажом бандыт...*
*Ясь застаўся*
*з голым задам*
*Праз даляравы крэдыт*

набрала максімальную колькасць балаў. А значыць, маленькаму рэдакцыйнаму журы нічога не заставалася, як пагадзіцца і прыз у выглядзе падпіскі на дарагую сэрцам газету на першы квартал наступнага 2020 года пакінуць у Мінску.

...Хочаце, каб «Звязда» пяць разоў на тыдзень прыходзіла і да вас? Тады варыянтаў два: альбо афармляйце падпіску (можна — на месяц, на два...), альбо ўважліва глядзіце на новы конкурсны здымак, складайце подпісы — кароткія (не больш за восем радкоў), трапныя, дасціпныя — і дасылайце ў рэдакцыю. Шанц на перамогу мае кожны!

**Валянціна ДОЎНАР.**

# ПУНСОВЫ ВЕРАСНЁЎСКІ СКАРБ



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Суседняе з Ельняй балота Жады сёлета стала сапраўднай Меккай для збіральнікаў журавін — такога небывалага ўраджаю ягад не прыпомняць нават старэйшыя мясцовыя жыхары. Сапраўды, спелыя, налітыя сокам буйныя журавіны чырвонымі караламі ўслалі балотны мох. Яны просяцца ў жменю, у рот, у вядро. Пра журавінавы скарб гавораць і бывалыя ягаднікі. Тыя, хто раней хадзіў на Ельню — а там цяпер неўраджай, гэтым разам прабіраюцца топкімі сцяжынамі жадаўскага балота да запаведнага ягаднага раю. А да яго — пяць-шэсць кіламетраў. Тым, хто жыве ў вёсках Басянкі, Балаі, Немірова, Кабякі — вёскі знаходзяцца на краі балота, лягчэй. Іншым прыходзіцца ехаць за дзясяткі кіламетраў — жыхарам Мёр, Глыбокага, Полацка. Лепель, наогул, знаходзіцца за сто з гакам кіламетраў ад балота. І адтуль таксама едуць, каб зарабіць добрую капейку. Нават сямідзесяцігадовая Галіна Жук з Мёр, якую я сустрэў на балоце, паўтары гадзіны ішла па зыбкай, па калена ў вадзе, дарозе, каб выканаць свой штодзённы план нарыхтоўкі. Па гэтай жа дарозе з дваццаццю кілаграмамі за плячыма яна будзе вяртацца на працягу трох гадзін. І так кожны лагодны восеньскі дзянёк на працягу сезона, пакуль не выпадзе снег! Цікава, што і яна, і іншыя жанчыны (яны асноўныя збіральшчыкі) кажуць: «Не лянуйся, збірай — журавін хопіць усім!»

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

*Мёрскі раён.*

**Больш здымкаў гэтага рэпартажу глядзіце на сайце zviazda.by**













# Извещение
# о проведении открытого аукциона по продаже земельных участков на право заключения договора аренды

| | | | |
|---|---|---|---|
| 1 | Дата, время и место проведения аукциона, организатор торгов | Аукцион состоится 5 ноября 2019 года в 11.00 по адресу: Гомельская область, г. Жлобин, ул. Петровского, 45<br>Коммунальное унитарное предприятие по операциям с недвижимым имуществом «Жлобинский центр управления районной коммунальной собственностью» | |
| 2 | Срок приема документов | **С 9.00 до 17.00 по рабочим дням по 1 ноября 2019 года** | |
| 3 | Номер лота | 1 | 2 |
| 4 | Адрес земельного участка | Гомельская область, Жлобинский район, г. Жлобин, ул. Ленинградская (район ГСПК «Жлобинский Эскорт») | Гомельская область, Жлобинский район, г. Жлобин, микрорайон 16 (район торгового центра, возле павильона «Книги») |
| 5 | Кадастровый номер участка | 321850100001002443 | 321850100001004244 |
| 6 | Площадь, га | 0,4317 | 0,0024 |
| 7 | Целевое назначение | Земельный участок для строительства объекта «Многоуровневый гараж-стоянка со станцией технического обслуживания» (размещение автостоянок и гаражей (в том числе по ремонту и обслуживанию автомобилей) | Земельный участок для установки павильона по оказанию услуг (земельный участок для размещения объектов иного назначения) |
| 8 | Срок аренды | 10 (десять) лет | 10 (десять) лет |
| 9 | Характеристика территории и расположенных на участке инженерных коммуникаций; строений и сооружений; инженерно-геологические условия | Участок свободен от застройки<br>(инженерно-геологические условия будут определены на стадии производства проектно-изыскательских работ) | |
